

ЯК ЗРАБІЦЬ АРГАНІЗМ «АБЫЯКАВЫМ» ДА СТРЭСАЎ? 6

ДЛЯ ПАЛЯПШЭННЯ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ МС



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 КАСТРЫЧНІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 192 (30326)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## КОРАТКА

• У Палаце прадстаўнікоў адкрыта анлайн-прыёмная, дзе любая арганізацыя (прадпрыемства) можа звярнуцца і пакінуць заяўку на правядзенне адкрытага дыялогу з удзелам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у сваім працоўным калектыве. Звяртацца можна праз месенджары і мабільную тэлефонную сувязь па нумары +375 29 674 95 97.

• Ацяпленне ўключылі ў дзіцячых садках, школах і бальніцах Мінска, у Віцебску таксама пачынаюць падаваць цяпло ў аб'екты сацсферы.

• Самыя нізкія стаўкі па крэдытах сярод краін ЕАЭС зафіксаваны ў Беларусі.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр (на пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета):**

*«На сучасным этапе развіцця сусветная эканоміка схільная да цэлага шэрагу крызісных тэндэнцый. Практычна паўсюдна адбываецца павышэнне суверэннай пазыковай і фіскальнай нагрузкі. Назіраецца страта даверу да ключавых сусветных валют. Насуперак так званым каштоўнасцям глабалізацыі, аб якіх нам дзесяцігоддзямі настойліва паўтаралі так званыя цывілізаваныя краіны, па іх жа ініцыятыве высокімі тэмпамі ідзе рэгіяналізацыя сусветнага рынку. Мае месца дэвальвацыя міжнароднага права і аўтарытэту шматлікіх міжнародных арганізацый, у тым ліку эканамічнага профілю. Усе гэтыя фактары ствараюць небяспечную нявызначанасць у сусветнай эканоміцы.*
*І ў гэтых няпростых умовах асаблівае значэнне набывае рэгіянальная інтэграцыйная салідарнасць».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «МЫ ЗРОБІМ УСЁ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ РЭГІЯНАЛЬНУЮ ЯДЗЕРНУЮ БЯСПЕКУ»

### Падрабязнасці сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і гендырэктара МАГАТЭ

**Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) — міжурадавая арганізацыя ў сістэме ААН, створаная ў 1957 годзе. Членамі агенцтва з'яўляюцца 180 дзяржаў. Рэспубліка Беларусь уваходзіць у МАГАТЭ з моманту яго стварэння. Сярод асноўных функцый МАГАТЭ — аказанне дзяржавам-членам неабходнай дапамогі і развіццё навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва ў галіне мірнага выкарыстання атамнай энергіі; садзейнічанне ў забеспячэнні належнага ўзроўню ядзернай і радыяцыйнай бяспекі; кантроль за тым, каб атамная энергія выкарыстоўвалася выключна ў мірных мэтах і ядзерныя матэрыялы не пераключаліся на ваенныя мэты.**



Фота БелТА.

### «Вопыт Беларусі спатрэбіцца арганізацыі ў любым пункце планеты»

На пачатку сустрэчы, якая адбылася ў Палацы Незалежнасці, Прэзідэнт адзначыў, што яму асабіста, а таксама беларусам вельмі імпануе актыўная работа Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі апошнім часам. «Мы вас часта бачым, знаёмы з вашымі заключэннямі і заявамі, — звярталюціся да Рафаэля Гросі, паведаміў Аляксандр Лукашэнка. — Мы вельмі станоўча ацэньваем вашу работу, звязаную з бяспекай атамных станцый, асабліва тых, якія апынуліся ў зоне фактычных баявых дзеянняў, — Запарожскай і Курскай».

СТАР. 3

Альтэрнатыва

# АДКРЫВАЮЧЫ НОВЫЯ МАРШРУТЫ

### Першы груз па Паўночным марскім шляху прыбыў у Беларусь




Фота Лізаветы ГОЛАД.

**У транспартна-лагістычны цэнтр «Магілёў-Белмытсэрвіс» 30 верасня прыбыў першы груз па маршруце Паўночнага марского транспартнага калідора. Тым самым быў адкрыты новы для беларускага рынку кантэйнерны сэрвіс.**

СТАР. 4

Прыкметы часу

# СВАЕ ЯБЛЫКІ І ГРУШЫ

### Як развіваецца айчыннае садоўніцтва?

**Калісьці беларуская зямля славілася сваімі садамі, багатымі ўраджаямі яблыкаў і груш. Потым наш рынак захапіў імпарт. Цяпер настаў час адраджаць беларускае садоўніцтва, у адсутнасці знешняй канкурэнцыі развіваць сваю вытворчасць пладовай прадукцыі, падкрэсліваюць навукоўцы. Для гэтага ёсць і тэхналогіі, і новыя сарты.**




Фота Лізаветы ГОЛАД.

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У БЕЛАРУСІ ЗАЎСЁДЫ РАДЫ СТАРЫМ СЯБРАМ І НОВЫМ ПАРТНЁРАМ, ЗАЦІКАЎЛЕНЫМ ВА ЎМАЦАВАННІ І РАЗВІЦЦІ АДНОСІН З НАШАЙ КРАІНАЙ»

## Прэзідэнт прыняў даверчыя граматы ад паслоў замежных дзяржаў

**Аляксандр Лукашэнка шчыра павіншаваў кіраўнікоў дыпламатычных місій у нашай краіне з афіцыйным уступленнем на пасады. Новыя паслы прадстаўляюць Кітай, Казахстан, Сербію, Алжыр, Маўрытанію, Бурундзі, Кувейт, Уругвай і Дамініканскую Рэспубліку.**

Прэзідэнт шчыра вітаў усіх у Беларусі і выказаў спадзяванне, што ў дыпламатаў ужо была магчымасць пазнаёміцца з Мінскам, яго славутасцямі, пагутарыць з людзьмі і даведацца гісторыю беларускай дзяржавы. «Яна шматгранная, у ёй нямала гераічных старонак, і мы ёю па праве ганарымся! — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Ганарымся слаўнымі подзвігамі продкаў, працавітымі сучаснікамі, якія працягваюць умацоўваць любімую краіну і выхоўваць годную змену».

### «Толькі беларускі народ мае права вырашаць свой лёс»

Па словах кіраўніка дзяржавы, хутка паслы самі пераканаюцца, наколькі беларусы гасцінныя і міралюбівыя. «Нягледзячы на ўзрослыя пагрозы і выклікі, дзверы нашага дома заўсёды застаюцца адчыненымі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Красамоўнае сведчанне — бязвізавы рэжым для грамадзян 35 еўрапейскіх дзяржаў, устаноўлены гэтым летам. Для нас няма несяброўскіх народаў і другарадных краін. Ведаю, што і да беларусаў ва ўсім свеце ставяцца з ветлівасцю і цеплынёй».

Прэзідэнт са шкадаваннем заўважыў, што мірная, квітнеючая і суверэнная Беларусь у асобных заходніх палітыкаў выклікае раздражненне, якое перарастае ў прадузятасць. «Яны лічаць нармальным сваё аднабокае састарэлае ўспрыманне светаўладкавання, дзе ёсць людзі першага і другога гатунку, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — А калі хтосьці не згодны з іх пунктам гледжання — душаць санкцыямі і рознымі абмежаваннямі. Мінск з такой несправядлівасцю сутыкаецца ўжо шмат гадоў. Практычна ўсю суверэнную гісторыю. Тым не менш мы бяром на сябе смеласць праводзіць самастойную палітыку — унутраную і знешнюю. І заўсёды адстойваем сваю пазіцыю, заснаваную на міжнародным праве і справядлівасці».

У той жа час у адрас нашай краіны часта гучаць неабгрунтаваныя прэтэнзіі. Напрыклад, аб садзейнічанні нелегальнай міграцыі. «Хачу нагадаць: Беларусь у межах сваіх міжнародных абавязацельстваў і магчымасцяў, якія ёсць, спыняе нелегальныя міграцыйныя каналы і змагаецца з транснацыянальнай злачыннасцю, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але калі ствараюцца пэўныя праблемы, звязаныя з міграцыяй, то гэта пытанні не да нас. Гэта пытанні да тых, хто гэтых мігрантаў паклікаў да сябе ў краіну. Мы па-чалавечы клапоцімся аб людзях, якія былі вымушаны пакінуць свае краіны і шукаць прытулак у Еўрапейскім саюзе. І ўсё гэта робім без чыёй-небудзь дапамогі, знаходзячыся пад прэсам незаконных санкцый».

Па меркаванні кіраўніка дзяржавы, чарговай падставай для знешніх нападак на Беларусь стане, відавочна, кампанія па выбарах Прэзідэнта. «Гэта кампанія па нападках



Фота БелТА.

на Беларусь ужо пачалася, вы гэта ведаеце, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Ужо, напэўна, пачалі пісаць нарыхтоўкі гучных планаў па «звяржэнні рэжыму» і прасіць мільёны долараў грантаў на гэтыя бескарысныя мэты. Кожныя пяць гадоў просяць. Адразу засмучу ідэйных натхняльнікаў: расхістаць сітуацыю і ўвесці краіну ў бездань хаосу мы не дазволілі і не дазволім. Вы гэта ўбачыце».

Прэзідэнт падкрэсліў, што нашых людзей не трэба агітаваць за Беларусь. «Яны разумеюць, што яны самі і ёсць гэта Беларусь, — заўважыў ён. — Моцная, стабільная і незалежная. Толькі беларускі народ мае права вырашаць свой лёс, падабаецца гэта камусьці ці не».

### Сябры і партнёры, правераныя часам

Звяртаючыся да прысутных, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў гэтай зале ўражальная дыпламатычная геаграфія. «Тут сабраліся блізкія па духу людзі, аб'яднаныя адзіным імкненнем — ствараць і ўмацоўваць сувязі на карысць народаў нашых краін», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што 1 кастрычніка, калі адбылася цырымонія ўручэння даверчых грамат паслані замежных дзяржаў, адзначаецца 75-я гадавіна ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі. Карыстаючыся выпадкам, у асобе пасла беларускі лідар павіншаваў увесь кітайскі народ з іх вялікім нацыянальным святам. «Гэта і наша свята, — заўважыў Прэзідэнт. — Для нас вельмі знакава, што менавіта ў гэты дзень вы ўручаеце даверчыя граматы. Кітайская Народная Рэспубліка для Беларусі заўсёды была і застаецца найважнейшым, надзейным і асаблівым гандлёва-эканамічным і палітычным партнёрам».

Па словах кіраўніка дзяржавы, паміж Мінскам і Пекінам дасягнуты беспрэцэдэнтна высокі ўзровень даверлівага супрацоўніцтва. «Ва ўмовах сусветнай палітычнай напружанасці мы змаглі вывесці двухбаковыя адносіны на ўзровень усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, — канстатаваў ён. — Нягледзячы на крызісныя працэсы ў глабальнай эканоміцы, па выніках мінулага года дабіліся новага рэкорду ў тавараабароце».

Асаблівую падзяку за канструктыўны падыход да супрацоўніцтва Аляксандр Лукашэнка выказаў свайму дарагому сябру — Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіну, папрасіў перадаць яму добрыя пажаданні. Лідара Кітая чакаюць з візітам у Беларусі ў зручны для яго час.

Важным, правераным часам сябрам, стратэгічным партнёрам і саюзнікам для нашай краіны з'яўляецца Казахстан. «Сёння практычна няма такіх сфер, дзе б у нас не было агульных інтарэсаў, — сказаў Прэзідэнт. — Аб высокай дынаміцы супрацоўніцтва сведчаць штогадовы мільярдны тавараабарот і паспяховыя праекты ў прамысловай кааперацыі». Аляксандр Лукашэнка чарговы раз выказаў словы падзякі Прэзідэнту Казахстана Касым-Жамарту Такаеву за ўсялякую падтрымку, аказаную нашай краіне ў час казахстанскага старшынства ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

### «Для сапраўднага сяброўства адлегласцяў не існуе»

Па словах кіраўніка дзяржавы, мы традыцыйна выбудоўваем дружалюбныя адносіны з Рэспублікай Сербія. «Яны заснаваны на трывалых гістарычных і духоўных сувязях паміж нашымі брацкімі народамі, — канстатаваў ён. — Зацікаўлены ў актывізацыі ўсяго комплексу беларуска-сербскага супрацоўніцтва і пашырэнні кантактаў, развіцця ўзаемавыгаднай кааперацыі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, ахове здароўя, іншых сферах, у тым ліку з выкарыстаннем высокіх тэхналогій».

Беларусь гатова да актыўнай прамысловай кааперацыі, супрацоўніцтва ў сферах харчовай бяспекі і высокіх тэхналогій з Алжырам. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць у тым, што наша тэхніка (трактары, камбайны, грузавікі), нашы збожжасховішчы будуць карысныя для алжырскай эканомікі. Таксама ён выказаў надзею на працяг сумеснай плённай працы на міжнародных пляцоўках.

З асаблівым задавальненнем Прэзідэнт вітаў у Палацы Незалежнасці пасла Маўрытаніі — краіны-старшыні Афрыканскага саюза. Сёлета Беларусь і Маўрытанія адзначаюць 20-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з гэтай значнай датай і выказаў перакананасць, што ўзаемныя кантакты неабходна актывізаваць. «Аснова для гэтага маецца, — звярнуў увагу ён. — Прапаную вызначыць два-тры флагманскія ўзаемавыгадныя праекты, дзе мы можам быць карысныя адзін аднаму, і прыступіць да іх рэалізацыі».

Беларусь зацікаўлена і ў развіцці дружалюбных сувязяў з Рэспублікай Бурундзі, надае асаблівую важнасць эканамічнаму складніку міждзяржаўных адносін. З улікам развіцця ў Бурундзі сельскай гаспадаркі і распрацоўкі карысных выкапняў наша краіна можа прапанаваць шырокі спектр машынабудаўнічай прадукцыі, уключаючы грузавую, будаўнічую кар'ерную і сельскагаспадарчую тэхніку. Акрамя таго, па словах кіраўніка дзяржавы, Беларусь мае значныя магчымасці для падрыхтоўкі спецыялістаў, неабходных для работы ў розных галінах эканомікі.

«Важным партнёрам у рэгіёне Блізкага Усходу для нас з'яўляецца Кувейт, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы высока ацэньваем імкненне вашай краіны да мірнага ўрэгулявання канфліктаў і крызісаў (вы ў гэта сур'ёзна ўцягнуты, як і Беларусь), а таксама гуманітарныя намаганні на міжнароднай арэне. Гэта сугучна нашым мірным ініцыятывам аб пачатку шырокага міжнароднага дыялогу аб прынцыпах і гарантыях бяспекі. Гатовы прыкласці ўсе намаганні для нарошчвання гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага партнёрства па ўсіх напрамках».

Дамініканская Рэспубліка разглядаецца ў якасці перспектыўнага партнёра ў Цэнтральнай Амерыцы і Карыбскім басейне. «Пры гэтым эканамічны вектар лічым найбольш важным і ўзаемавыгадным, — удакладніў беларускі лідар. — Мы адкрыты для любых формаў кааперацыі. Прапаную пачаць са стварэння эфектыўнай дагаворна-прававой базы. Пераканаты, што пагадненне аб узаемнай адмене віз, якое плануецца да падпісання, не толькі ажывіць турызм, але і стане важным імпульсам для актывізацыі двухбаковых адносін».

Па словах Прэзідэнта, вельмі ўважліва наша краіна сочыць за развіццём Уругвая. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што паспяховае правядзенне маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбараў у кастрычніку гэтага года прымножыць дасягненні гэтай краіны, якія існуюць. «Беларусь заўсёды падтрымае выбар уругвайскага народа, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Мы зацікаўлены ў актывізацыі ўзаемадзеяння як на палітычным, так і на эканамічным трэку, чаму магло б садзейнічаць падпісанне Пагаднення аб узаемнай адмене віз. Разлічваем на актыўную пазіцыю пасла ў выбудоўванні эфектыўных і даверлівых двухбаковых кантактаў».

Рэзюмуючы, Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі заўсёды рады старым сябрам і новым партнёрам, зацікаўленым ва ўмацаванні і развіцці адносін з нашай краінай. «Дакладна ведаю: для сапраўднага сяброўства адлегласцяў не існуе, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Мы адкрыты для новых ідэй, накіраваных на рэалізацыю самых амбіцыйных праектаў. Абсалютна перакананы: ваша знаходжанне на нашай зямлі будзе камфортным, работа — прадуктыўнай, а супрацоўніцтва — узаемавыгадным».

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

Як адзначыў у размове з журналістамі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан ВЭНЬЧУАНЬ,** для яго вялікі гонар у дзень святкавання 75-годдзя ўтварэння Кітая ўручыць даверчыя граматы Прэзідэнту Беларусі. «Кітай і Беларусь — сапраўдныя сябры і надзейныя партнёры, — падкрэсліў ён. — Як дзясяты пасол Кітая ў Беларусі я прыбыў сюды для ўмацавання нашага традыцыйнага сяброўства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Беларусь славіцца сваёй шматвяковай гісторыяй, багатай культурай, цудоўнымі пейзажамі і, самае галоўнае, добрымі і мірнымі людзьмі. Паміж нашымі краінамі ўстаноўлена ўсепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства».

Дыпламат расказаў, што за два тыдні, якія ён знаходзіцца ў нашай краіне, пазнаёміўся з многімі беларускімі сябрамі. «Спадзяюся, што як мага хутчэй змагу паглыбіцца ў жыццё беларускага грамадства і разам з нашымі беларускімі сябрамі прыкласці намаганні для ўмацавання нашага сяброўства і супрацоўніцтва», — падкрэсліў пасол.

Чжан Вэньчуань расказаў, што апошні раз быў у Беларусі ў 2001 годзе. «За гэтыя гады пад кіраўніцтвам паважанага Прэзідэнта ў Беларусі адбыліся вялікія змены, — заўважыў ён. — Я бачу тут вельмі шмат новых збудаванняў, людзі жывуць спакойна, вельмі добра. Таму, як сапраўдныя сябры, мы рады поспехам нашых беларускіх сяброў і выказваем упэўненасць, што пад кіраўніцтвам паважанага Прэзідэнта наш сябар-народ, беларусы, дасягнуць яшчэ большых поспехаў у развіцці і будаўніцтве сваёй краіны».

Па словах **Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь Цімура ЖАКСЫЛЫКАВА,** дзвюм краінам варта ўзмацняць супрацоўніцтва — як у палітычнай, так і эканамічнай і культурна-гуманітарнай сферах. «Будзем працаваць над тым, каб ва ўсіх кірунках наша плённае супрацоўніцтва пашыраць, — дапоўніў ён. — У плане эканомікі вельмі важна працаваць над актыўнай рэалізацыяй сумесных праектаў у сферы прамысловай кааперацыі. У нас цяпер 11 такіх праектаў».

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Іліна ВУКАЙЛАВІЧ** вельмі рада, што за апошнія чатыры месяцы, якія яна жыве і працуе ў Беларусі, паспела ўбачыць нашу краіну, даведацца, як мы працуем і жывём. «У вас моцныя прадпрыемствы, моцная прамысловасць, вельмі вялікі навуковы патэнцыял, — канстатавала дыпламат. — Будзем імкнуцца сумесна працаваць, развіваць нашы адносіны. Сербія — краіна, якая хутка развіваецца. Так што ў нас сумесны патэнцыял сапраўды вялікі. Сёлета адзначаем 30-годдзе нашых дыпламатычных адносін. Плануем рухацца далей — па ўсіх кірунках».

# «...КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ РЭГІЯНАЛЬНУЮ ЯДЗЕРНУЮ БЯСПЕКУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што шмат добрага чуў аб гендырэктары МАГАТЭ. «Шмат расіяне расказвалі аб вашых візітах, аб вашым прафесійным падыходзе ў вырашэнні тых ці іншых пытанняў, — удакладніў ён. — Мы гэта вельмі высока цэнім. З часу ўтварэння нашай арганізацыі мы з'яўляемся яе членамі і надавалі і надаём вельмі сур'ёзнае значэнне супрацоўніцтву з вамі. Гэта перш за ўсё тлумачыцца тым, што мы сталі ядзернай дзяржавай, мы пабудавалі атамную станцыю».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі пабудавалі самую сучасную і самую бяспечную атамную станцыю ў свеце. «І асаблівасць наша заключаецца ў тым, што мы яе пабудавалі, вобразна кажучы, на пустым месцы, — удакладніў беларускі лідар. — У нас не было ні спецыялістаў, ні вопыту, ні ведаў у эксплуатацыі атамнай станцыі. Але мы гэтаму навучыліся. Мы своечасова падрыхтавалі спецыялістаў, вельмі вялікую дапамогу ў гэтым плане аказалі нам Расійская Федэрацыя і МАГАТЭ. Таму мы свабодна можам сёння казаць аб бяспецы нашай станцыі. А той вопыт, які мы назапасілі ў Беларусі, спатрэбіцца нашай арганізацыі ў любым пункце планеты».

## «Мы дагэтуль змагаемся з наступствамі чарнобыльскай катастрофы»

Па словах кіраўніка дзяржавы, спекуляцыі наконт эксплуатацыі Беларускай атамнай электрастанцыі былі, ёсць і будуць. «Вы гэта бачыце ў Літве: ім няймецца не толькі наконт нашай атамнай станцыі, але і ўвогуле ў сувязі з тым, што адбываецца ў нашай Беларусі, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Але гэта ўжо палітыка, не будзем аб гэтым гаварыць. Увогуле, вы павінны ведаць, што мы прыхільнікі бяспекі, міру і зробім усё, на што здольныя, што ад нас залежыць, для таго, каб забяспечыць рэгіянальную ядзерную бяспеку. У гэтым вы можаце не сумнявацца. Мы разумныя людзі і на рознага роду авантуры не кідаемся».

Беларускі лідар звярнуў увагу, што невыпадкова ўзняў гэтую тэму. Апошнім часам ва ўкраінскіх сродках масавай інфармацыі гучаць заявы аб тым, што нібыта «Лукашэнка хоча захапіць Чарнобыльскую станцыю». Кіраўнік дзяржавы не можа зразумець: што ляжыць у аснове гэтай фэйкавай інфармацыі?

«Навошта Лукашэнку Чарнобыльская станцыя? — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар. — Мы і так нацярпеліся ад таго, што адбылося пасля выбуху гэтай атамнай станцыі, якую, заўважце, мы не будавалі, мы не абслугоўвалі і мы не ўзрывалі. А асноўная бяда лягла на чвэрць нашай тэрыторыі, і мы дагэтуль змагаемся з наступствамі чарнобыльскай катастрофы. Таму я вас абсалютна запэўніваю, што гэта глупства поўнае, якое мяне нават здзівіла. Мы ў страшным сне не маглі ўявіць, што нам давядзецца «захапіць» Чарнобыльскую станцыю і за яе затым адказваць. Няма такой неабходнасці: ні з боку Беларусі, і, паверце мне, ні з боку Расіі таксама. Не было, няма і ніколі не будзе».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Рафаэль Гросі прыехаў у добрую, дружалюбную краіну, дзе жыве вельмі міралюбівы народ. «І народ, які прыхільны развіццю атамнай энергетыкі, бо за ёй — будучыня, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Нам атамная энергетыка вельмі патрэбная для нашай эканомікі, якая дынамічна развіваецца».

На завяршэнні Прэзідэнт падзякаваў гендырэктару МАГАТЭ за падтрымку і дапамогу, якую агенцтва заўсёды аказвала Беларусі ў развіцці мірнага атама, і выказаў спадзяванне на добрае і шчыльнае супрацоўніцтва.

## «Беларусь выступае прыкладам»

У сваю чаргу генеральны дырэктар Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) Рафаэль Гросі выказаў удзячнасць беларускаму лідару за гасціннасць і цёплы прыём. «Для мяне вялікі гонар знаходзіцца ў Беларусі разам з маімі намеснікамі і маёй камандай, — адзначыў ён. — Мы наведваем вашу краіну і абмяркоўваем цэлы шэраг пытанняў».

Гендырэктар МАГАТЭ расказаў, што дагэтуль успамінае свой першы візіт у Мінск 12 гадоў таму, калі ў Астраўцы яшчэ нічога не было. «Сёння ж з вялікім задавальненнем можна назіраць, што абодва энергаблокі ядзернай электрастанцыі знаходзяцца ў эксплуатацыі, — дадаў ён. — Для мяне асабліва прыемна пачуць, што на самым высокім узроўні, у дадзеным выпадку на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, выяўляецца самая сур'ёзная прыхільнасць да забеспячэння ядзернай бяспекі. Гэта сведчыць аб многім. І перш за ўсё гэта сведчыць аб прафесіяналізме, якім валодае ваша краіна на доўгім шляху станаўлення дзяржавы, якая выраблае атамную энергію».

Па словах Рафаэля Гросі, праект па будаўніцтве атамнай станцыі ў Астраўцы з самага пачатку меў мноства пытанняў і выклікаў. «І Беларусь у гэтым выпадку выступае прыкладам таго, як краіна можа працаваць з агенцтвам, таго, як шчыльна можа ўзаемадзейнічаць з экспертамі і місіяй нашай арганізацыі і паказваць адкрытасць вашай краіны да гэтага пытання», — канкрэтызаваў ён.

### ❍ У тэму

У размове з журналістамі **генеральны дырэктар Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі Рафаэль ГРОСІ** падзяліўся падрабязнасцямі сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі. «Мы абмеркавалі шэраг вельмі важных пытанняў у адкрытай і даверлівай абстаноўцы, — паведаміў ён. — Перш за ўсё гэта датычылася абстаноўкі ў рэгіёне, канфлікту на Украіне, выклікаў і небяспек, якія нясе ў сабе сітуацыя ў рэгіёне. Я змог падрабязна праінфармаваць спадара Прэзідэнта аб рабоце МАГАТЭ, якую вядзе наша агенцтва, пачынаючы з самага пачатку канфлікту, па забеспячэнні ядзернай бяспекі на атамных электрастанцыях Украіны. Для мяне было вельмі важна пачуць ад Прэзідэнта Беларусі яго пазіцыю, яго падыходы да забеспячэння ядзернай бяспекі, яго падыходы па дасягненні міру ў рэгіёне. І гэтыя падыходы ён перадаў мне ў вельмі дакладнай, адкрытай манеры».

Гендырэктар МАГАТЭ расказаў аб сваіх планах наведаць БелАЭС, каб упэўніцца ў бяспечнай рабоце энергаблокаў. «Мы разумеем, наколькі важным для беларускай эканомікі было будаўніцтва гэтай атамнай станцыі, — удакладніў ён. — І нам вельмі прыемна, што наша агенцтва прымала самы непасрэдны ўдзел у будаўніцтве гэтай станцыі, забеспячэнні бяспекі гэтага аб'екта».

Адказваючы на пытанне журналістаў, ці ёсць у МАГАТЭ асцярогі наконт работы Беларускай атамнай станцыі, Рафаэль Гросі адзначыў, што ні ён як кіраўнік агенцтва, ні само МАГАТЭ не мела якіх-небудзь занепакоенасцяў або сумненняў у адносінах Беларусі. «Краіны, з якімі мы працуем (і ў дадзеным кантэксце гэта Рэспубліка Беларусь), выконваюць усё, што напісана ў рэкамендацыях», — канкрэтызаваў ён.

Кажучы аб рэгіянальнай ядзернай бяспецы і ўдзеле ў яе падтрыманні беларускага боку, гендырэктар агенцтва заўважыў, што перш за ўсё гэта шчыльная работа нашай краіны, самой атамнай станцыі з МАГАТЭ, дакладнае і паслядоўнае выкананне ўсіх рэкамендацый, усіх неабходных умоў, што, у сваю чаргу, па яго словах, дае сігнал як суседнім з Беларуссю краінам, так і краінам іншых частак свету, што Беларусь з'яўляецца надзейнай краінай, якая выконвае ўсе неабходныя рэкамендацыі і ажыццяўляе ўсе неабходныя меры па забеспячэнні ядзернай бяспекі.

Генеральны дырэктар МАГАТЭ расказаў, што ў цяперашні час спецыялісты агенцтва прысутнічаюць на Запарожскай АЭС. «Нам патрэбна перш за ўсё падтрымка нашых дзеянняў з боку ўсіх краін — членаў агенцтва, — падкрэсліў ён. — Беларусь з'яўляецца вельмі важным удзельнікам нашага агенцтва, таму, вядома, падтрымка, у тым ліку з боку Беларусі, нашых дзеянняў надзвычай важная. Спадзяюся, што ў будучыні, калі сітуацыя стабілізуецца і пачнецца працэс мірнага ўрэгулявання, і Беларусь, і агенцтва змогуць узяць больш актыўны ўдзел у сумеснай рабоце па вырашэнні праблем, якія існуюць у рэгіёне».

У Рафаэля Гросі спыталі, як МАГАТЭ з пункту гледжання бяспекі ацэньвае сітуацыю на Ігналінскай АЭС у Літве, звязаную з планамі гэтай краіны пабудаваць у сябе ядзерны магільнік. «Нам вядома як пра занепакоенасці беларускага боку дзеяннямі літоўскага боку, так і пра заклапочанасці літоўскага боку, якія гучалі ў адрас Беларусі, — заўважыў кіраўнік агенцтва. — Таму ў гэтым кантэксце неабходна наяўнасць такой арганізацыі, як МАГАТЭ, якая забяспечвала б аб'ектыўны падыход і аб'ектыўную ацэнку таго, што рэальна адбываецца. Ацэнку, якая грунтавалася б не на нейкіх палітычных перавагах, а на экспертызе, рэальных экспертных ведах. Вось такія падыходы маглі б прапаноўваць у якасці вырашэння тых спрэчак, якія існуюць або маглі б патэнцыяльна існаваць паміж краінамі. Мы ведаем, што адбываецца ва ўсіх краінах, і імкнёмся быць уцягнутымі ў тыя працэсы, якія знаходзяцца ў сферы нашай кампетэнцыі».

**Вераніка КАНЮТА.**

З нагоды

# НАШ ЗАЛАТЫ ФОНД

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава ў Дзень пажылых людзей наведала Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна сталіцы.**



Фота БелТА.

«У нашай краіне па добрай традыцыі па ініцыятыве Прэзідэнта 1 кастрычніка, у Дзень пажылых людзей праводзіцца акцыя «Павага. Клопат. Адказнасць». Павага і клопат да тых людзей, якія прайшлі дастойна свой жыццёвы шлях, якія так шмат зрабілі для нашай краіны: у гады Вялікай Айчыннай вайны абаранілі яе свабоду і незалежнасць, у пасляваенны час аднаўлялі з руін народную гаспадарку, нашы гарады і вёскі. А ў суверэннай гісторыі нашай дзяржавы мы ўсе разам стваралі нашу цудоўную суверэнную і незалежную краіну. І сёння ёй можна ганарыцца. І мы ганарымся», — адзначыла Наталля Качанава.

Людзі старэйшага пакалення — гэта наш залаты фонд, падкрэсліла спікер. «Гэта такі ўзрост, калі ты разумееш, што ўжо ў жыцці шмат чаго дасягнуў, жыццё тваё адбылося. Дасягнуў у чым? У тым, што выраслі дзеці, падрастаюць унукі. Дзякуй вам вялікі і нізкі паклон ад нас усіх за ўсё, што вы рабілі і робіце для нашай краіны, — сказала Старшыня Савета Рэспублікі. — Вы актыўна працуеце з моладдзю, расказваеце пра пройдзены няпросты шлях нашай краіны. Гэты год для нас асаблівы. Мы адзначылі 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзе Асноўнага закона нашай краіны — Канстытуцыі і інстытута прэзідэнцтва. Гэты Год якасці, калі мы гаворым аб тым, што павінны рабіць усё якасна і адносіны паміж людзьмі павінны быць годнымі і якаснымі».

У аснове дзяржаўнай палітыкі Беларусі — людзі, падкрэсліла спікер у размове з падапечнымі Тэрытарыяльнага цэнтра. «Усё, што робіцца ў краіне, — на карысць нашага народа. Будуецца жыллё, сацыяльныя аб'екты, пільная ўвага з боку ўрада да функцыянавання нашых прадпрыемстваў. Мы разумеем, што эканоміка — гэта бюджэт, гэта сродкі, якія можна накіроўваць у тым ліку на такія сацыяльныя ўстановы. Практычна 50 працэнтаў рэспубліканскага бюджэту — сацыяльныя артыкулы: ахова здароўя, адукацыя, культура, сацыяльная абарона, бяспека. І, зразумела, вельмі важна, каб працавала эканоміка», — адзначыла Наталля Качанава.

Пытанняў штодзень узнікае шмат, але яны вырашаюцца. «Пад мудрым кіраўніцтвам Прэзідэнта нашай краіны палітыка, якая выбудоўваецца, дае свае вынікі, — падкрэсліла спікер. — Вынік відавочны: усе разам мы стварылі такую цудоўную, суверэнную краіну».

«У старэйшага пакалення, якое звездала цяжар і нягоды, стаўленне да цяперашняга жыцця асаблівае, таму што вы разумееце, як было і што стала. І за гэтым — праца людзей, якія стваралі ўсё гэта, — сказала Наталля Качанава. — Нашу краіну ведаюць, шануюць і паважаюць на міжнароднай арэне, з намі лічацца. Паважаюць як краіну, дзе праводзіцца міралюбівая палітыка ў адносінах да суседніх дзяржаў. Прэзідэнт заўсёды падкрэслівае, што мы — краіна міралюбівая. Мы нацэлены толькі на мір і згоду».

Важна захаваць гэты астравок міру і бяспекі, адзначыла спікер. «Вы бачыце, што адбываецца ў свеце. Адбываюцца, на жаль, ваенныя канфлікты. Аднапалярны свет сыходзіць, і на змену яму прыходзіць шматпалярны. Кожная краіна хоча жыць па сваіх законах, традыцыях. Вядома, многім гэта не падабаецца. Таму наша задача — зрабіць усё, каб захаваць мір і спакой, каб нашы дзеці, унукі, праўнукі і пакаленні, якія ідуць за намі, жылі ў мірнай, прыгожай, квітнеючай краіне», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер падарыла Тэрытарыяльнаму цэнтру сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска тканіну для пашыву сцэнічных касцюмаў. «У гэты святочны дзень я б хацела пажадаць вам найперш здароўя, цяпла ад родных і блізкіх, ад людзей, з якімі вы маеце ўзаемасувязі. Шчасця, такой жа жыццёвай актыўнасці і заўсёды быць прыкладам для тых, хто ідзе за намі. Так, як любіце вы сваю краіну і свой народ, — гэтаму трэба вучыцца. Гэтыя ордэны на вашых кіцелях, пінжаках, блузках гавораць аб тым, што вы сапраўды годна пражылі сваё жыццё, жывяце актыўным жыццём, і вам за гэта вялікі дзякуй», — дадала Наталля Качанава.

Дзяржаўная ўстанова «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна горада Мінска» функцыянуе з чэрвеня 2000 года. У цэнтры працуе дзевяць аддзяленняў. Атрымліваюць сацыяльныя паслугі 1332 чалавекі, сацыяльную падтрымку — 4298 чалавек.

**Паводле БелТА.**




# АДКРЫВАЮЧЫ НОВЫЯ МАРШРУТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Паўночны марскі шлях — гэта найкарацейшы суднаходны маршрут паміж заходняй часткай Еўразіі і Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёнам, які дае магчымасць сэканоміць час для суб'ектаў гаспадарання да 40 % адносна традыцыйных паўднёвых марскіх калідораў, — адзначыў **першы намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белмытсэрвіс» Аляксандр СКАЧКОЎСКІ.**

Так, першы груз быў у дарозе 35 дзён. Партыя тавараў, прызначаная для беларускіх суб'ектаў гаспадарання, была адгружана ў порце Шанхая ў жніўні 2024 года. Марскі кантэйнеравоз прайшоў праз Чукоцкае мора, абыходзячы тэрыторыю Расійскай Федэрацыі па Паўночным марскім шляху, і прыбыў у порт Санкт-Пецярбурга, з якога аўтамабільным транспартам дастаўлены ў транспартна-лагістычны цэнтр «Магілёў-Белмытсэрвіс».




**Суднаходны маршрут праходзіць уздоўж паўночных берагоў Расіі па морах Паўночнага Ледавітага акіяна, злучае ў адзіную транспартную сістэму еўрапейскія і далёкаўсходнія парты Расіі, а таксама вусці суднаходных сібірскіх рэк. Яго працягласць ад праліва Карскія Вароты (каля архіпелага Новая Зямля) да бухты Прадбачання (у раёне Берынгава праліва) складае 5,6 тыс. км, а маршрут праз гэты транспартны калідор амаль у два разы карацейшы за іншыя марскія шляхі паміж Еўропай і Далёкім Усходам.**




Паводле слоў Аляксандра Скачкоўскага, гэты маршрут дае магчымасць адпрацоўваць вялікую наменклатуру тавараў, дастаўляць іх без усялякіх праблем у дастаткова бяспечнай лагістычнай прасторы.

— Сёння любы суб'ект гаспадарання, у тым ліку беларускі, можа даставіць прадукцыю на тэрыторыю Кітая. Трэба адзначыць і тое, што гэты маршрут мае навігацыйны перыяд з красавіка да кастрычніка, аднак, нягледзячы на гэта, будзе запатрабаваны бізнесам, — дадаў ён. — Да вытворчасцяў ужо дайшла інфармацыя аб тым, што мы арганізоўваем адпаведны сэрвіс у Рэспубліцы Беларусь. Штодня паступаюць званкі аб магчымасці дастаўкі тых ці іншых грузаў.

Якія ж магчымасці па аб'ёмах паставак у Паўночнага марскога шляху? Аляксандр Скачкоўскі падзяліўся, што на гэты момант судны разлічаны да пяці тысяч кантэйнераў, але гэта не мяжа. Пры неабходнасці аб'ёмы можна пашырыць да дзясятак тысяч кантэйнераў.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

Будзьце ў курсе

# КЛАДЗЕШ ПЕЧКІ — САМАЗАНЯТЫ, РОБІШ БОЧКІ — РАМЕСНІК

## Што змянілася для ІП з 1 кастрычніка

**Ключавое новаўвядзенне, якое ўступае ў сілу з 1 кастрычніка, — вызначэнне ўрадам пералікаў відаў дзейнасці для індывідуальных прадпрымальнікаў, фізічных асоб, якія ажыццяўляюць самастойную прафесійную дзейнасць, і рамеснікаў. Пералікі відаў дзейнасці, вызначаныя ўрадам, уступілі ў сілу з 1 кастрычніка. З гэтага моманту дзяржаўная рэгістрацыя ІП па відах эканамічнай дзейнасці, якія не ўключаны ў пералікі, ажыццяўляцца не будзе. Для дзейных ІП, віды эканамічнай дзейнасці якіх не ўвайшлі ў пералікі, прадугледжаны пераходны перыяд (да 31 снежня 2025 года) для перарэгістрацыі ў камерцыйную арганізацыю ў спрошчаным парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.**

**<u>У спіс дазволеных для ІП</u>** увайшла **дзейнасць у галіне сувязі, па забеспячэнні пажарнай бяспекі, правядзенні судовых экспертыз, звязаная з уздзеяннем на навакольнае асяроддзе, з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі** (за выключэннем афінажу каштоўных металаў, рэкуперацыі каштоўных камянёў, аптовага гандлю і каштоўных камянёў, скупкі ў грамадзян у вырабах і ломе, збору і перапрацоўкі такога лому і адходаў, якія паступаюць ад юрыдычных і фізічных асоб). Таксама ў пераліку для ІП **прысутнічае дзейнасць, звязаная з працаўладкаваннем за межамі Беларусі, са зборам і распаўсюджваннем інфармацыі аб фізічных асобах у мэтах іх знаёмства, паліграфічная дзейнасць, экспертыза тавараў.**

Акрамя таго, ІП дазволены пэўныя віды дзейнасці ў галіне сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі (напрыклад, **вырошчванне збожжавых, бабовых і насення алейных культур, агародніны, бахчавых, караняплодных і клубняплодных культур, грыбоў, тытуню, развядзенне некаторых відаў жывёл, лесанарыхтоўкі),** у апрацоўчай прамысловасці (у прыватнасці **вытворчасць хлебабулачных вырабаў і мучных кандытарскіх вырабаў, гатовых кармоў для хатніх жывёл, мэблі, ювелірных вырабаў, біжутэрыі, музычных інструментаў, спартыўных тавараў, гульняў і цацак),** у сферы будаўніцтва (у тым ліку **электрамантажныя, санітарна-тэхнічныя, ізаляцыйныя, тынкавальныя, сталярныя і цяслярскія, малярныя і шкляныя работы),** у галіне інфармацыі і сувязі **(дзейнасць па вытворчасці кіна-, відэафільмаў і тэлевізійных праграм, камп'ютарнае праграмаванне)** і інш.

У спіс дазволеных для ІП відаў дзейнасці ўвайшлі таксама **збор і апрацоўка сцёкавых вод, тэхнічнае абслугоўванне і рамонт аўтамабіляў, рознічны гандаль аўтамабільнымі дэталямі, вузламі і прыладамі для аўто, тэхнічнае абслугоўванне і рамонт матацыклаў, дзейнасць па мясцовай дастаўцы тавараў дадому, паслугі па грамадскім харчаванні, здача ў наём уласнай і арандаванай нерухомай маёмасці, рамонт камп'ютараў, прадметаў асабістага карыстання і бытавых вырабаў** і інш.

**<u>Што да самазанятых,</u>** у пералік увайшло больш за 80 відаў дзейнасці. У тым ліку **арэнда, пракат забаўляльнага і спартыўнага абсталявання (веласіпеды, канькі, турыстычны рыштунак і іншае), відэаздымка, відэамантаж, аднаўленне камп'ютараў, ноўтбукаў, планшэтных камп'ютараў пасля збою, рамонт, тэхнічнае абслугоўванне камп'ютараў і перыферыйнага абсталявання, выпас жывёлы, кашэнне траў.** Таксама самазанятыя могуць выконваць па замовах спажыўцоў **нарыхтоўку драўніны на дровы, мур (рамонт) печаў і камінаў, малярныя, шкляныя, тынкавальныя, сталярныя і цяслярскія работы, ачыстку і афарбоўку даху, афарбоўванне агароджаў і гаспадарчых пабудоў, устаноўку (мантаж) столяў** і г. д.

Сярод іншых відаў дзейнасці, дазволеных для самазанятых, — **дастаўка спажыўцам тавараў дадому, пісьмовы і вусны пераклад, прыборка ад снегу і лёду, выраб дублікатаў ключоў, настройка і рамонт музычных інструментаў, цырульні і касметычныя паслугі, манікюр і педыкюр, пагрузка і разгрузка грузаў, распілоўка і колка дроў, рэалізацыя спажыўцам кацянят і шчанят пры ўмове ўтрымання хатняй жывёлы (кошкі, сабакі), рамонт і аднаўленне мэблі, рамонт абутку, гадзіннікаў, чамаданаў, сумак, парасонаў, швейных і трыкатажных вырабаў, галаўных убораў, дываноў, рэпетытарства** і інш.

**<u>У пералік відаў рамеснай дзейнасці</u>** ўвайшлі **аўтэнтычныя, самабытныя рамёствы — бондарства; выраб і рамонт гужавых павозак, саней і дзіцячых санак, вырабаў, выкананых у лапікавай тэхніцы, нацыянальнага беларускага касцюма (яго дэталяў) з захаваннем традыцыйнага крою і вышыўкі, нацыянальных музычных інструментаў, традыцыйных нацыянальных прылад лоўлі рыбы і інш.; выраб пражы; кавальская справа; мастацкая апрацоўка і роспіс вырабаў з дрэва, каменя, косці, скуры, рога, металу, бляхі, шкла, керамікі, фанеры, прадстаўленых спажыўцом.** Тыя віды дзейнасці, якія не трапілі ў пералік, напрыклад, выраб вясельных аксесуараў, свечак, мыла, фізічная асоба зможа ажыццяўляць у якасці самастойнай прафесійнай дзейнасці.

**Паводле БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Ізраіль пачаў наземную аперацыю на поўдні Лівана



Армія абароны Ізраіля пачала абмежаваную па маштабах наземную аперацыю на поўдні Лівана, паведаміла ТАСС. Дзеянні сухапутных войскаў падтрымліваюць ВПС і артылерыя. Па заяве вайскоўцаў, аперацыя «Стрэлы поўначы» ў Лівane, якая пачалася 23 верасня, будзе працягвацца ў адпаведнасці з ацэнкай сітуацыі паралельна з баямі ў Газе і на іншых напрамках. 27 верасня ў Бейруце быў забіты лідар «Хезбалах» Хасан Насрула. Увогуле ў выніку ўдараў па Ліване за два тыдні загінулі больш за тысячу чалавек, заявіла афіцыйны прадстаўнік Упраўлення ААН па правах чалавека Элізабэт Тросэл. Больш за мільён жыхароў, або каля чвэрці насельніцтва краіны, былі вымушаны пакінуць свае дамы з пачатку ізраільскай аперацыі. Аб гэтым паведаміў каардынатар цэнтра хуткага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі, міністр навакольнага асяроддзя Насер Ясін, словы якога згадвае ліванскае інфармацыйнае агенцтва Al Wataniya.

## Прэм'ер-міністрам Японіі абраны Сігэру Ісіба



Старшыня кіруючай у Японіі Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП) Сігэру Ісіба, які ў мінулым займаў пасаду кіраўніка мінабароны, абраны 102-м прэм'ер-міністрам краіны. Пра гэта паведаміла японская тэлерадыёкампанія NHK. Кіраўнік урада выбіраецца большасцю галасоў з прадстаўленых партыямі кандыдатаў. Як правіла, гэта лідары партый. Такім чынам, прэм'ер-міністрам становіцца кіраўнік партыі, якая мае большасць месцаў у парламенце. Паколькі ў кіруючай кааліцыі ў складзе ЛДП і партыі «Камэйта» большасць у абедзвюх палатах парламента, абранне Ісібы на пасаду прэм'ера было больш фармальнасцю. Новы склад урада будзе зацверджаны імператарам Японіі Нарухіта. Пры гэтым ужо 9 кастрычніка чакаецца роспуск ключавой ніжняй палаты парламента, а правядзенне датэрміновых усеагульных выбараў — 27 кастрычніка.

## Колькасць ахвяр паводак у Непале перавысіла 200 чалавек



Залевы, якія працягваюцца ў Непале на працягу некалькіх сутак, выклікалі маштабныя паводкі і апоўзні ў даліне Катманду. Улады Непала мабілізавалі каля 10 тысяч паліцэйскіх, вайскоўцаў і добраахвотнікаў для правядзення пошукава-ратавальных работ. Больш як 3,5 тысячы чалавек былі эвакуіраваны з пацярпелых раёнаў. Ратавальнікі працягваюць пошукі зніклых, выкарыстоўваючы верталёты і надзіманыя лодкі, аднак надзеі знайсці тых, хто выжыў, практычна не засталося, паведаміла «Бі-бі-сі». Сезон мусонаў штогод суправаджаецца моцнымі дажджамі, што прыводзіць да паводак і апоўзняў у Непале. Сёлета асноўны ўдар стыхіі прыпаў на сталіцу краіны Катманду, дзе затоплена больш за тысячу дамоў. Прэс-сакратар урада Непала Суба Гурунг паведаміў, што, акрамя жылля, стыхія разбурыла лініі электраперадач, водаправодныя камунікацыі і іншыя аб'екты інфраструктуры.

# СВАЕ ЯБЛЫКІ І ГРУШЫ



Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута пладаводства, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Юлія КАНДРАЦЁНАК.

## Каб душа ляжала да справы

Прамысловае пладаводства ў нашы дні — навукаёмістая галіна сельскай гаспадаркі, эфектыўнасць якой дасягаецца за кошт прымянення інавацыйных тэхналогій вытворчасці і захоўвання. Гэта значыць, патрэбны сучасныя сарты, высокатэхналагічныя сховішчы і адзіная дзяржпраграма. Пра тое, што гатовыя прапанаваць айчынныя селекцыянеры беларускім вытворцам, мы даведаліся, пабываўшы на штогадовым семінары «Калекцыя сартоў яблыні і грушы» Інстытута пладаводства.

Кожную восень гэты семінар збірае практыкаў — перш за ўсё прыватнікаў і фермераў — з усёй Беларусі. Свята (а для садаводаў гэта сапраўды свята і важная падзея, якой чакаюць цэлы год) дорыць сустрэчы з калегамі, многія з якіх знаёмыя паміж сабой, практычныя рэкамендацыі навукоўцаў, інфармацыю аб новых сартах з магчымасцю набыць саджанцы. І, вядома ж, дэгустацыю яблыкаў, вырашчаных у доследных садах Інстытута пладаводства. Якая ж сустрэча без пачастунку?

— Прыязджаю на семінар не першы год, — дзеліцца садавод Сяргей. — Ацаніць новыя сарты, паслухаць навукоўцаў. Цікава, што з'явілася новага ў селекцыянераў. У мяне свой сад пад Оршай, вырошчваю яблыкі ў тым ліку на продаж і цяпер збіраюся пашыраць сартавую разнастайнасць. Зноў жа, гэта магчымасць «ужывую» сустрэцца з калегамі — садаводамі-аматарамі, фермерамі: многіх я ведаю, падтрымліваю ўзаемаадносіны, жыццё





пазнаёміла. Для мяне сад — у першую чаргу хобі, а потым ужо, так бы мовіць, бізнес. Трэба, каб душа ляжала да гэтай справы, тады ўсе праблемы вырашальныя, а ад працы атрымліваеш задавальненне.

## Ніводнага шанцу хваробам

— Селекцыя яблыні сёння ідзе ў асноўным у кірунку стварэння сартоў познезімовага тэрміну спажывання, здольных не толькі доўга захоўвацца, але і дэманстраваць высокія спажывецкія якасці, — тлумачыць **вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута пладаводства, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Юлія КАНДРАЦЁНАК.** — Наша работа накіравана на стварэнне зімаўстойлівых і, што немалаважна для сучаснага беларускага клімату, які ўвесь час змяняецца, высока адаптыўных сартоў. У гэтым адрозненне беларускай селекцыі ад селекцыі пладовых культур у іншых краінах. У той жа Заходняй Еўропе акцэнт не толькі на спажывецкія якасці, але і на зімаўстойлівасць, хваробаўстойлівасць і высокую адаптыўнасць пладовых і ягадных дрэў.

Ніводны сорт, які б добры ні быў, не зможа рэалізаваць свой патэнцыял, калі ён не мае зімаўстойлівасці і пашкоджваецца хваробамі, падкрэслівае суразмоўніца. Прыкладам увасаблення ў жыццё асноўных прынцыпаў беларускай селекцыі можна назваць адну з навінак — сорт яблыні «Крапач».

— Тут мы здолелі сумясціць адразу чатыры гены ўстойлівасці да самага небяспечнага захворвання яблыні — паршы, — тлумачыць Юлія Кандрацёнак. — Чым такія сарты выгадныя для вытворцы? Яны не патрабуюць масіраванай хімічнай абароны. То-бок, гэта атрыманне экалагічна чыстай пладовай прадукцыі, што сёння вельмі запатрабавана.

Сарты папярэдніх пакаленняў — «Лігал», «Айдарэд», «Шампіён» — цудоўныя па сваіх спажывецкіх якасцях, але няўстойлівыя да хвароб і маюць патрэбу ва ўзмоцненай абароне, адзначае яна. У прыватнасці, «Лігал» часам патрабуе да 20—26 апрацовак за сезон: кожны тыдзень-паўтара яго трэба абараняць. Толькі тады вытворца атрымае якасны ўраджай. Калі гэтага не зрабіць, увесь ураджай можа быць страчаны. Парша выклікае не толькі страту ўраджаю. Гэта і псаванне спажывецкіх якасцяў яблыкаў, і спадарожныя захворванні пладовых дрэў.

— Таму ўстойлівасць да хвароб — адзін з найважнейшых кірункаў сучаснай селекцыі яблынь і груш у Беларусі, — заключае спецыяліст. — А таксама пластычнасць, адаптыўнасць, зімаўстойлівасць, высокія спажывецкія якасці. І вось цяпер ідзе запыт на сарты, здольныя захоўвацца доўга, аж да новага ўраджаю.

## Вырасціць і захаваць

Такія сарты яблыкаў у Беларусі ўжо ёсць.

— Калі мы возьмем наш вядомы сорт «Імант», ён нават ва ўмовах звычайных захавальных камер пры — што немалаважна! — вытрымцы тэхналогіі вырошчвання (абарона, падкормкі, своечасовае здыманне) і правільным захоўванні можа ляжаць да чэрвеня ўключна, — падкрэслівае Юлія Кандрацёнак. — Але ёсць і другі кірунак, здольны дапамагчы забяспечыць краіну пладовай прадукцыяй практычна на ўвесь год. Гэта распрацоўка тэхналогій захоўвання.

У прыватнасці, размова пра выкарыстанне камер з рэгуляваным газавым асяроддзем, канкрэтызуе спецыяліст. У такіх камерах ствараецца атмасфера, дзе вельмі мала кіслароду і шмат вуглякіслага газу. У ёй усе фізіялагічныя працэсы ў пладах спыняюцца, і зняты ў верасні яблык можа без страт даляжаць да наступнага жніўня.

— У Беларусі такіх сховішчаў пакуль няшмат, але яны ёсць, — кажа суразмоўніца. — І я лічу, каб забяспечыць краіну пладовай прадукцыяй, трэба працаваць і ў кірунку селекцыі, і ў кірунку стварэння высокатэхналагічных сховішчаў, дзе гэтая прадукцыя гарантавана захаваецца да новага ўраджаю.

Над чым жа працуюць селекцыянеры?

— Распрацоўваем стратэгіі стварэння новых позніх сартоў. Ужо створаны «Карпач», «Белана», «Дыямент». Сарты новага пакалення — гэта як новае пакаленне камп'ютараў або айфонаў (у нашым выпадку валодаюць надзвычай высокімі спажывецкімі якасцямі на фоне ўстойлівасці да фактараў асяроддзя), — заўважыла навуковы супрацоўнік. — Плюс вялікая работа вядзецца ў кірунку селекцыі груш. Рэалізоўваецца маштабная праграма па стварэнні сартоў грушы менавіта познезімовага спажывання. На семінары мы прадставілі свае напрацоўкі і ў гэтай галіне, у прыватнасці тыя гібрыды, якія ў далейшым стануць сартамі, а таксама новыя, якія прайшлі складаную шматступенную сістэму выпрабаванняў.

Гэта, напрыклад, сорт грушы «Завея», — наш адказ знакамітай «Канферэнцыі».

— У адрозненне ад «Канферэнцыі», «Завея» не падмярзае ў нашых умовах, дае вельмі буйныя плады прыгожага, насычанага жоўтага колеру. Пры гэтым у грушы «Завея» выдатныя смакавыя якасці, плюс здольнасць захоўвацца да студзеня — лютага. А калі выкарыстоўваць РГА-сховішчы, гэты тэрмін можна значна падоўжыць, — запэўніла Юлія Кандрацёнак.

Пра яшчэ адзін найноўшы беларускі сорт груш распавяла **селекцыянер Вольга ЯКІМОВІЧ:**

— Цяпер па грушы асноўная работа накіравана на атрыманне сартоў позняга тэрміну паспявання — такі запыт у вытворцаў. Навінка нашай калекцыі — сорт грушы «Калядная». Гэта найлепшы, на мой погляд, позні сорт беларускай селекцыі, сёлета мы перадалі яго на дзяржаўнае сортавыпрабаванне. Перш за ўсё, матачнае дрэва запладаносіла на пяты год, а для грушы гэта ўнікальна: звычайна дрэва не на прышчэпе ўступае ў плоданашэнне на 7—9 год. Добра сябе паказаў гэты сорт на розных прышчэпах: і на насеннай, і на клонавай. «Калядная» вельмі ўраджайная, плады буйныя як на маладых, так і на старых дрэвах, няма перыядычнасці ў плоданашэнні — ураджай садоўнік збярэ штогод. Валодае высокай устойлівасцю да хвароб і выдатнымі смакавымі якасцямі.

## Тэхналогія поспеху

Распрацоўка высокаэфектыўнай тэхналогіі пад кожны канкрэтны сорт — сусветны трэнд і важны прынцып «дакладнага земляробства».

— Для пладовых культур гэта перш за ўсё выкарыстанне сумяшчальных, якасных прышчэп. У Беларусі ёсць праблема: у свой час сюды была завезена з Польшчы вялікая колькасць заражанага матэрыялу, што адмоўна адбіваецца на працягласці жыцця нашых садоў, — кажа Юлія Кандрацёнак.

Таксама сучасныя тэхналогіі садаводства прадугледжваюць штучнае арашэнне. Засуха стала звычайнай з'явай у Беларусі, асабліва ў паўднёвых рэгіёнах краіны, і ў такіх умовах атрымаць якасныя яблыкі і грушы без штучнага паліву немагчыма, адзначае навуковец. Акрамя таго, неабходна распрацоўка сістэм падкормак, якія ўлічваюць сартавыя асаблівасці. Напрыклад, ёсць сарты яблыкаў, адчувальныя да недахопу кальцыю. Значыць, неабходна ўключыць у тэхналогію іх вырошчвання адпаведныя падкормкі.

— Сучасныя тэхналогіі садаводства — гэта і выкарыстанне мікраэлементаў, біялагічных стымулятараў, якія павышаюць устойлівасць раслін да неспрыяльных фактараў асяроддзя, — распавядае вучоны. — Аддзел тэхналогіі пладаводства распрацоўвае пад канкрэтны сорт таксама сістэму фарміроўкі. Бо ў кожнага сорту ёсць асаблівасці галінавання і закладкі пладовай драўніны, якія трэба ўлічваць. Напрыклад, «Елена» — выдатны летні, суперранні сорт. Але ў яго кампактная крона са схільнасцю да ўтварэння вострых развілак. Такія дрэвы неабходна абразаць, «раскладаючы» крону, з тым, каб фарміраваліся больш спадзістыя развілкі, не схільныя да разломаў.

Калі забяспечыць беларускім сартам высокую тэхналогію ўтрымання, яны праявяць сябе ў нашых умовах лепш за заходнееўрапейскія або амерыканскія, падкрэслівае суразмоўніца.

## Каштоўныя яблыні

На штогадовыя семінары Інстытута пладаводства практыкі прыязджаюць у першую чаргу для таго, каб ацаніць навінкі — патрымаць у руках, панюхаць, пакаштаваць яблыкі новых сартоў. Аб кожным з іх спецыялісты ўстановы могуць разважаць гадзінамі.

— У 2021 годзе ў Дзяржаўны рэестр уключаны два новыя сарты яблыні восеньскага тэрміну спажывання, — працягвае Юлія Кандрацёнак. — Быў такі запыт ад вытворцаў, «Аксаміт» і «Паланэз» запаўняюць гэтую нішу. Абодва выдатнага смаку. «Аксаміт» на нядаўнім «Фестывалі навукі» быў адзначаны паслом Расіі. Гэта буйны, ярка афарбаваны таварны яблык салодкага смаку з прыемнай кансістэнцыяй сакавітай мякаці — не мяккай і не занадта цвёрдай. «Паланэз» выдатна захоўваецца ў халадзільнай камеры да снежня. Новы зімовы сорт «Крапач», як ужо адзначалася, устойлівы да паршы, філасціктозу і іншых хвароб, і яго можна пазіцыяніраваць як сорт для вытворчасці экалагічна чыстай прадукцыі. І, вядома, не магу не згадаць «Дыямент» — адзіны на дадзены момант беларускі сорт яблыні, які запатэнтаваны ў Еўрасаюзе. Гэтыя яблыкі валодаюць непаўторным, яркім водарам, характэрным для старадаўніх сартоў, і прыемным, гарманічным кісла-салодкім смакам. Пры гэтым бялюткая мякаць не цвёрдая ды храбусткая.

У спажыўцоў ёсць перавагі, бо ўсе мы купляем вачыма. Дык вось, даследаванні паказваюць, што ў большасці выпадкаў пакупніку падабаюцца яблыкі яркай, насычанай афарбоўкі з мякаццю чыста-белага, без дадатковых адценняў, колеру. І той, хто адзін раз пакаштаваў саспелы «Дыямент», становіцца яго прыхільнікам, рэзюмавала навуковы супрацоўнік:

— Пра гэта трэба казаць. Каб нашы аграрыі разумелі: беларускія сарты не саступаюць замежным. Замежныя ў Беларусь прыходзяць са сваёй тэхналогіяй вырошчвання, і фермер яе выконвае. Але, паверце, нашым сартам сучасныя інтэнсіўныя тэхналогіі таксама неабходны. Між тым часцяком можна пачуць меркаванне: беларускае само выжыве. Не, падыход павінен быць аднолькавы. У гэтым выпадку нашы сарты пладовых культур — на арашэнні, на добрай абароне і добрай фертыгацыі — пераўзыходзяць многія замежныя па ўраджайнасці, смакавых якасцях і працягласці захоўвання.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Вакцынацыя

# ПРЫШЧЭПКІ, ГІГІЕНА І ІМУНІТЭТ

## Эксперты пра тое, як не падхапіць ВРВІ і грып

**Распачынаецца сезон халадоў, а разам з ім надыходзіць час рэспіраторных захворванняў. Ад якіх з іх варта прышчапіцца і каму неабходна гэта зрабіць у першую чаргу, расказалі спецыялісты.**

### УЗДЫМ ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ

На долю рэспіраторных інфекцый прыпадае больш за 98 % ад усіх інфекцыйных захворванняў у краіне. Як адзначыў **загадчык аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кірыл ІГНАТАЎ**, у цяперашні час адзначаецца ўздым захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі. Гэта звязана ў першую чаргу з надыходам восені, з фарміраваннем новых дзіцячых калектываў і пачаткам навучальнага працэсу, з заканчэннем сезона водпускаў і вяртаннем у свае працоўныя калектывы.

Характэрнай рысай восені з'яўляецца павелічэнне долі хворых сярод дзяцей. У цяперашні час захваральнасць дзяцей вышэйшая, чым дарослых. Пры гэтым па выніках лабараторных даследаванняў пакуль пераважаюць негрыпозныя вірусы. Адзначаецца ў краіне павелічэнне колькасці выпадкаў захваральнасці на COVID-19. Гэта таксама звязана з надыходам восені. Увогуле ж вірус SARS-CoV-2 працягвае набываць усё больш сезонны характар, а захворванне працякае ў асноўным у няцяжкай форме.

Што датычыцца папярэджання рэспіраторных інфекцый, то вакцынапрафілактыка з'яўляецца найбольш эфектыўным і абгрунтаваным метадам не толькі ў адносінах да грыпу і COVID-19, але таксама і іншых рэспіраторных інфекцый. Ёсць і неспецыфічная прафі-



лактыка, якая складаецца з простых правіл. У выпадку пагаршэння самаадчування, недамагання ў першую чаргу неабходна звяртацца ў арганізацыі аховы здароўя па атрыманне кваліфікаванай медыцынскай дапамогі. Акрамя таго, прытрымлівацца рэспіраторнага этыкету пры знаходжанні ў людных грамадскіх месцах, у тым ліку ў паліклініках, праветрываць памяшканне, праводзіць вільготную прыборку, прытрымлівацца здаровага ладу жыцця, рэжыму працы і адпачынку, мець фізічную актыўнасць і паўнацэнна харчавацца.

### ПРЫШЧАПІЦЦА АД ГРЫПУ І COVID-19

Вакцынацыя супраць грыпу праводзіцца ў нашай краіне кожны год. У адпаведнасці з нацыянальным календаром прафілактычных прышчэпак ёй падлягаюць тыя людзі, для якіх грып можа несці найбольшую пагрозу здароўю. Гэта дзеці ва ўзросце ад 6 месяцаў да 3 гадоў, дзеці ад 3 гадоў і дарослыя з хранічнымі захворваннямі, асобы з імунадэфіцытнымі станамі, людзі ва ўзросце, старэйшым за 65 гадоў, цяжарныя жанчыны, медыцынскія, фармацэўтычныя работнікі, работнікі ўстаноў з кругласутачным рэжымам знаходжання і работнікі дзяржаўных органаў, якія забяспечваюць бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць насельніцтва.

Як паведаміў Кірыл Ігнатаў, у гэтым эпідсезоне ў нашай краіне вакцынацыя супраць грыпу будзе праводзіцца трыма вакцынамі: трохкампанентнай «Грыпол плюс» (яна будзе даступная на бясплатнай аснове), чатырохкампанентнымі «Ваксігрып Тэтра» і «Інфлювак Тэтра».

— У адпаведнасці з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя штамавы склад вакцын быў зменены. Змяніўся штам А—H3N2: штам Дарвін, які быў у мінулым годзе, замянілі на штам Тайланд. У чатырохвалентныя вакцыны дадаткова да асноўных трох штамаў (А—H1N1 Вікторыя, А—H3N2 Тайланд і В — Аўстрыя) дадаткова ўваходзіць штам грыпу В — Пхукет, — расказаў Кірыл Ігнатаў.

Вакцынацыя супраць COVID-19 таксама будзе праводзіцца — з кастрычніка да снежня. Чакаецца пастаўка супрацькавідных вакцын з абноўленым штамавым складам.

— У цэлым хацелася б адзначыць, што вакцынацыя — найбольш эфектыўны метад прафілактыкі рэспіраторных інфекцый, грыпу, каранавіруснай інфекцыі. Пры гэтым не варта забываць, што яна не гарантуе, што вы наогул не заразіцеся ні COVID-19, ні грыпам. Вакцынацыя абараняе ад цяжкага ходу гэтых захворванняў і ад неспрыяльнага зыходу, — нагадаў Кірыл Ігнатаў.

### ШТО ТАКОЕ ДОБРЫ ІМУНІТЭТ?

Як зразумець, што ў вас пачынаецца вострае рэспіраторнае захворванне ці грып? Сярод першых сімптомаў **загадчык кафедры агульнай урачэбнай практыкі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя БДМУ Ірына ПАЦЯЮК** называе пашкоджанне верхніх дыхальных шляхоў, а менавіта закладзенасць носа, слёзацячэнне, галаўны боль, недамаганне, выдзяленні з носа, пяршэнне ў горле, боль пры глытанні. Для грыпу галоўны першы сімптом, які рэзка ўзнікае, — высокая ліхаманка. Але кожны арганізм індывідуальны — ва ўсіх інфекцыя працякае па-рознаму.

Як адзначыла Ірына Пацяюк, пры добрым імунітэце арганізм мае высокую верагоднасць справіцца з віруснай нагрузкай. Чым жа характарызуецца добры стан імунітэту? Гэта найперш адсутнасць уплыву іншых захворванняў, пераахаладжэння, недахопу вітамінаў. Дарэчы, увосень вітамінаў шмат, і мы можам спажываць іх разам з даступнымі прадуктамі. Тая ж капуста — банальная гароднiна, даступная ўсім. Увогуле ўся зялёная гародніна — ліставая, шпінат, салата — добрая крыніца вітамінаў.

Важны для імунітэту і дастатковы сон.

— Наш арганізм вельмі цяжка перажывае недасыпанні. Як толькі нам працяглы час недастаецца сну, мы становімся лёгкай мішэнню для любога ўзбуджальніка, тым больш для ўсюдыіснага віруса, які шукае, куды пасяліцца. Таксама важна пазбягаць стрэсаў, — нагадала Ірына Пацяюк.

Як жа можна зменшыць вірусную нагрузку? Найперш гэта маска. Яна абараняе ад вялікай колькасці віруса, але не можа працаваць стапрацэнтным фільтрам. Важна таксама не забываць мыць рукі. Калі часам няма такой магчымасці, можна насіць у сумачцы ці ў кішэні дазаваныя антысептыкі. Гэта таксама дапамога паменшыць вірусную нагрузку. Не варта церці вочы, нос і тым самым дадаткова заносіць мікробы на паверхню сваіх слізістых.

Карысна ведаць

# У ПАЛОНЕ СМУТКУ

## Як справіцца з восеньскай хандрой?



**Пачатак восені быў проста цудоўны: сонца і цеплыня. Але каляндарны год ідзе сваёй чаргой, і на змену цяплу прыйшло халоднае, дажджлівае надвор'е. І раптам мы заўважаем, што з'яўляюцца стомленасць, праблемы са сном, дрэнны апетыт і думкі пра тленнасць быцця. Нападае невыносная туга, якая парушае звыклы ход рэчаў і разбурае жыццё. Такі стан прынята называць восеньскай хандрой, і ён знаёмы многім з нас. З чым ён звязаны і як з ім справіцца? Некалькі практычных парад дала намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 31-й гарадской паліклінікі Мінска Ала МАСКАЛЁВА.**

— Што такое восеньская хандра? Гэта пагаршэнне настрою, якое ўзнікае на фоне сезоннай дынамікі, звязанай з рэзкім скарачэннем светлавога дня і памяншэннем колькасці сонечнага святла. Яно прыводзіць да змяншэння выпрацоўкі гармонаў шчасця — серотаніну, норадрэналіну і дафаміну. Хандра можа быць справакавана частымі прастудамі і зніжэннем імунітэту. Яе прычын некалькі: змена пор года, асабліва перыяд скарачэння светлавога дня. Таксама могуць уплываць змена гарманальнага балансу на фоне ўзроставых змяненняў ці закаханасці, пераутамленне, калі знясілены ўнутраныя рэсурсы арганізма, — расказвае Ала Уладзіміраўна.

Па сімптаматыцы хандра вельмі падобная да дэпрэсіі, але гэтыя станы адрозніваюцца. Дэпрэсія — псіхічнае расстройства, а хандра ўяўляе сабой сезонную з'яву, якая зніжае якасць жыцця і перашкаджае самарэалізацыі.

— Той, хто пакутуе на хандру, прагне яркіх эмоцый. Чалавек у стане дэпрэсіі да ўсяго абыякавы. Здаровая асоба паспяхова перажывае змену сезонаў, а псіхічна няўстойлівая ў гэты перыяд адчувае абвастрэнне захворвання. Ад хандры можна пазбавіцца намаганнем волі, ад дэпрэсіі — нельга. Пры дэпрэсіі апатычны стан доўжыцца тыднямі, а хандра праходзіць з першымі праменямі сонца. Чалавек падчас хандры раздражняецца, злуецца. Пры дэпрэсіі ён абыякавы да ўсяго. У адрозненне ад дэпрэсіі, хандра ахоплівае не ўсе сферы жыцця. Пры ёй людзі здольныя смяяцца і жартаваць. Сезонная хандра толькі прымушае паглынаць вугляводы, а дэпрэсія падрывае здароўе. Хандра псуе жыццё, але не фатальна, у той час як дэпрэсія можа прывесці да суіцыду, — тлумачыць розніцу ўрач.

Як жа зрабіць свой арганізм больш «абыякавым» да сезонных стрэсаў? Вось некалькі парад, якія дапамогуць нармалізаваць нервовую сістэму і ставіцца да любой праблемы спакойна і з усмешкай.

**Адчувайце сябе ў любой сітуацыі пераможцам.** Прыміце дрэнны настрой і пачніце з ім эфектыўна змагацца. Зірніце на свет з радасцю, і адзін гэты погляд выганіць вашы хваробы. Хадзіце, выпрастаўшы спіну і з высока паднятай галавой. Нават асабісты ўрач Напалеона Банапарта заўсёды заўважаў, што салдаты, параненыя ў баі пры перамозе, папраўляліся лёгка і хутка. А тыя, што пры адступленні, — доўга і з цяжкасцю. Адсюль і выснова: раны ў пераможцы гояцца хутчэй.

**Смейцеся.** Хвіліна смеху падаўжае жыццё на паўгадзіны. Чытайце анекдоты, глядзіце камедыі, сустракаючыся з сябрамі, гаварыце толькі пра добрае, успамінайце вясёлыя выпадкі з жыцця. Смех — найлепшыя лекі ад галаўнога болю і стомленасці. Дзякуючы смеху прыйдзе ў норму страваванне і сон, палепшацца абменныя працэсы, нармалізуецца сэрцабіцце.

**Старайцеся больш хадзіць пешшу.** 20—40 хвілін штодзённых прагулак толькі станоўча паўплываюць на ваш арганізм. Хада актыўна супрацьстаіць дэпрэсіўным станам, праганяе стомленасць і здымае зрокавую нагрузку.

**Старайцеся часцей бываць на сонцы.** Завядзіце сабаку для штодзённых працяглых прагулак на прыродзе ці ката для прыемных тактыльных адчуванняў. У вячэрні і начны час крыніцай святла і выратаваннем ад маркоты стануць яркія лямпы асвятлення, якія забяспечаць эфект фотатэрапіі.

**Больш спіце.** Каб не стаць ахвярай заўчаснага старэння, падаўжайце свой сон да васьмі гадзін у суткі. Як толькі пачняце высыпацца, усе адмоўныя наступствы недасыпу пройдуць. Палепшыцца памяць, знізіцца верагоднасць захворвання на дыябет, сардэчна-сасудзістай сістэмы і неўралагічных расстройстваў. Не трэба думаць аб праблемах на ноч. Гэта вельмі моцна ўплывае на сон. Успомніце народную мудрасць: «Пераначуем, болей пачуем». Прачнуўшыся раніцай, не трэба перш за ўсё ісці на кухню, каб выпіць гарачай кавы. Лепш зрабіце простую ранішнюю зарадку. Гэтая мышачная размінка дапаможа не толькі прачнуцца, але і пазбавіцца ад нервовага напружання. Калі вам дазваляе час, можна нават зрабіць невялікую прабежку на свежым паветры.

**Старайцеся раней прачынацца.** Адпаведна, раней і кладзіцеся. Сустракайце світанак і пражывайце ўвесь светлавы дзень ад пачатку да канца. Пад уздзеяннем сонечных прамянёў арганізм выпрацоўвае гармон мелатанін. Апошні павялічвае эмацыянальны тонус чалавека і амаладжвае.

**Правільна харчуйцеся.** Ваш «псіхічны імунітэт» павысяць усе прадукты, якія ўтрымліваюць ёд. Як ні дзіўна, але марожанае цудоўна здымае стрэс. Шакалад дапаможа падняць настрой, павялічыць ціск крыві і частату пульсу. Любы чалавек, які не дабірае сваю норму салодкага, заўсёды будзе знаходзіцца ў раздражнёным і прыгнечаным настроі.

**Уключайце ў рацыён вітаміны.** Восеньская хандра негатыўна ўплывае на імунітэт, так што прыём вітамінных комплексаў і больш збалансаваны, насычаны рацыён дапамогуць прывесці ў парадак нервы, цела і душу. Па прызначэнні ўрача можна дадаць у рацыён вітамін D, вітаміны групы B, вітамін C, цынк і магній.

**Папрацуйце над самаацэнкай.** Вас пачнуць любіць толькі ў тым выпадку, калі вы самі сябе любіце і паважаеце. Таму для атрымання поспеху і дабрабыту пачніце працаваць над сабой і павысьце самаацэнку. Спачатку навучыцеся прымаць сябе такім, які вы ёсць. Не настройвайцеся на сумныя ноткі, думайце пазітыўна. Кантактуйце з прыемнымі і цікавымі людзьмі, рабіце для іх нешта добрае.

Важна ўстанавіць для сябе новую жыццёвую пазіцыю: «Ува мне ёсць што шанаваць і чым ганарыцца». Але акрамя ацэнкі сваіх добрых якасцяў не забудзься адэкватна ўсведамляць і недахопы, якія з'яўляюцца неад'емнай часткай кожнай асобы. Варта таксама зразумець: дабрабыт і дастатак — не асноўныя характарыстыкі чалавека. Грошы і становішча могуць у імгненне знікнуць, а ўнутранае напаўненне і душа застануцца заўсёды. Не забывайце працаваць над сабой і развіваць чалавечыя якасці.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

2 кастрычніка 2024 г. № 37 (770 )

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# ДЛЯ ПАЛЯПШЭННЯ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ



## Парламентарыі і прадстаўнікі мясцовай улады на выязным семінары абмеркавалі рэалізацыю грамадзянскіх ініцыятыў і службу «адно акно»






**ВЫЯЗНЫ семінар Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прайшоў у Брэсцкай вобласці. Мерапрыемства прысвячалася вывучэнню пытанняў рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў і арганізацыі дзейнасці службы «адно акно» на прыкладзе горада Баранавічы, Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў. У рабоце семінара разам з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў удзел прынялі члены Савета Рэспублікі, старшыні абласных, раённых, Мінскага гарадскога Саветаў, старшыні абласных, раённых, сельскіх выканаўчых камітэтаў, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў.**

### ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ЗАКОНАЎ — НА ПРАКТЫЦЫ

Падчас адкрыцця выязнога семінара Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка падкрэсліў, што работа з людзьмі, забеспячэнне эфектыўнай зваротнай сувязі і даверлівага дыялогу з'яўляюцца вызначальнымі ў дзейнасці вертыкалі ўлады. «Работа парламентарыяў не заканчваецца падрыхтоўкай і прыняццем канкрэтнага закона, — сказаў спікер ніжняй палаты. — Мы адсочваем прымяненне законаў у акругах падчас стасункаў з выбаршчыкамі і правапрымяняльнікамі, вывучэння зваротаў, якія да нас паступаюць. Гэта дазваляе зрабіць заканатворчы працэс неразрыўным, што азначае: прымаць законы, ацэньваць эфектыўнасць рэалізацыі іх нормаў на практыцы і пры неабходнасці ўносіць карэкціроўкі, якія запатрабаваны жыццём». Таму і праводзяцца падобныя семінары, каб на месцы ўбачыць вынікі прымянення таго ці іншага закона. На гэты раз дэпутацкія камісіі прапанавалі да разгляду адразу дзве тэмы: рэалізацыя грамадзянскіх ініцыятыў і арганізацыя дзейнасці службы «адно акно».

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр Пархомчык прывітаў парламентарыяў на брэсцкай зямлі і выказаў спадзяванне, што падчас наведванняў яны ўбачаць нямала цікавага, атрымаюць карысную для сябе інфармацыю. Губернатар коратка ахарактарызаваў работу службы «адно акно» ў Брэсце, а таксама прывёў прыклады цікавых ініцыятыў. Напрыклад, такіх, як фестываль «Сомінская юшка» ў Івацэвіцкім раёне. Некалькі гадоў таму фэст зарадзіўся як свята вёскі, якое зладзіла група энтузіястаў, аматараў рыбалкі і актыўнага адпачынку. Паступова мерапрыемства пачало разрастацца да раённага, потым — да рэспубліканскага, а цяпер яго можна, відаць, лічыць міжнародным, бо людзі прыязджаюць на гэты фестываль нават з замежжа. «І разам з тым ён застаецца цёплым, сямейным святам. Там праводзіцца конкурс на спартыўную лоўлю рыбы, на найлепшую юшку. Ладзяцца канцэрты і забаўляльныя мерапрыемствы для дзяцей. Людзі з усёй ваколіцы едуць у Сomіна на свята. Гэта і ёсць прыклад народнай ініцыятывы, якая вылілася ў добрую справу для ўсіх», — сказаў Пётр Пархомчык.

### ЯК ІНІЦЫЯТЫВА СТАНОВІЦЦА СПРАВАЙ

Каб ахапіць большую тэрыторыю і ўбачыць больш прыкладаў, дэпутаты падзяліліся на секцыі. Першая секцыя пачала работу з наведвання мемарыяла ў гонар лётчыкаў — Герояў Рэспублікі Беларусь Андрэя Нічыпорчыка і Мікіты Куканенкі. Мемарыял, да якога ўсклалі кветкі, а таксама памятныя дошкі на вуліцах, якія носяць імёны герояў, з'явіліся менавіта ў выніку рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў па ўвекавечанні памяці герояў. Першымі з такой ініцыятывай выйшлі саслужыўцы лётчыкаў па 61-й авіяцыйнай базе. І ўжо да гадавіны подзвігу быў адкрыты памятны знак у выглядзе двух каваных жураўлёў, якія імкнуцца ў неба на фоне самалёта. Аўтар ідэі канкрэтны чалавек — маёр Аляксандр Чарнышоў, а птушак зрабіў каваль з Баранавіч Мікалай Траяновіч. Імёнамі герояў названы вуліцы ў новым мікрараёне горада. Па ініцыятыве прафсаюзных актывістаў была выраблена мемарыяльная дошка і размешчана на жылым доме, які стаіць на скрыжаванні вуліц маёра Андрэя Нічыпорчыка і лейтэнанта Мікіты Куканенкі.


*(Заканчэнне на 8-й стар.)*


ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Пад знакам сацыяльнага клопату

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА прыняла ўдзел у пасяджэнні Наваполацкага гарадского выканаўчага камітэта. На ім разглядаліся пытанні прафілактыкі па бытавым і працоўным уладкаванні асоб, якія стаяць на ўліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі, стану рэцыдыўнай злачыннасці (пра гэта «Звязда» пісала ва ўчарашнім нумары). Аднак Старшыня Савета Рэспублікі выказалася і на іншыя важныя для ўсёй краіны тэмы, у прыватнасці аб фарміраванні рэспубліканскага бюджэту на наступны год.**

«Я хачу давесці патрабаванні, якія стаяць перад намі ўсімі. Мы павінны эфектыўна працаваць, каб фарміраваць бюджэты ўсіх узроўняў. Сёння даецца больш прэферэнцый мясцовым органам улады ў прыняцці рашэнняў. Усе павінны разумець: ад работы асобных прадпрыемстваў залежыць эканоміка нашай краіны ў цэлым. У гэтым працэсе важны кожны чалавек. І з катэгорыяй асоб, аб якіх мы сёння гаворым, будзе вырашаць іх праблему толькі МУС або Міністэрства аховы здароўя. Толькі ўсе разам, — адзначыла Наталля Качанава. — Трэба фарміраваць планы на 2025 год. На пасяджэнні экспертнага савета мы ўжо разгледзелі прагнозныя дакументы на наступны год. Міністр фінансаў давёў інфармацыю аб фарміраванні рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на 2025 год».

Бюджэт застаецца сацыяльна накіраваным. «Ні адна праграма, якую ўзяла на сябе дзяржава па рабоце з людзьмі, не закрываецца, а наадварот, мы глядзім як далей падтрымліваць неабароненыя катэгорыі грамадзян. Усё ідзе ў нас з прыростам. У рэспубліканскім бюджэце амаль палова — сацыяльныя артыкулы: адукацыя, ахова здароўя, культура, спорт, — падкрэсліла спікер. — Якія б санкцыі да нас ні прымянялі, вы бачыце, што эканоміка працуе, рост заработнай платы забяспечаны. У сістэме аховы здароўя мы дасягнулі росту заработнай платы, якая меркавалася ў 2025 годзе. Таму цяпер стаіць задача захаваць яе. Мы павінны глядзець на эфектыўнасць работы, як працуе кожнае прадпрыемства, якія створаны ўмовы для людзей, як выплачваецца заработная плата, якія ёсць праблемы ў працоўных калектывах — вось на што трэба звяртаць увагу, асабліва кіраўнікам прадпрыемстваў. Не трэба самазаспакойвацца. Усё можна вырашаць. Усё трэба вырашаць. Усё ў нашых руках».

***

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей СІВЕЦ прыняў удзел у рабоце круглага стала ў Парку высокіх тэхналогій на тэму «Развіццё кагнітыўнага інтэлекту ў рамках дадатковай адукацыі для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця».**

У фармаце дыялогавай пляцоўкі былі абмеркаваны пытанні дыягностыкі кагнітыўнага інтэлекту дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра, рэалізацыі распрацаванай Паркам высокіх тэхналогій індывідуальнай праграмы дадатковай адукацыі для дзяцей і моладзі «Інфарматыка без разеткі — для кожнага дзіцяці», метадычныя рэкамендацыі па забеспячэнні навукова-метадычнага суправаджэння гэтай праграмы.

У мерапрыемстве таксама прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Парка высокіх тэхналогій, Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі, Гомельскага абласнога цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, устаноў дашкольнай адукацыі.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# ДЛЯ ПАЛЯПШЭННЯ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Дэпутаты наведалі і сярэднюю школу № 1 Баранавічаў імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца. Дарэчы, імя героя было прысвоена школе ў выніку рэалізацыі грамадзянскай ініцыятывы, з якой выступілі гараджане.

Вынікам правядзення ў жыццё яшчэ адной грамадзянскай ініцыятывы стала адкрыццё першага ў краіне Музея народнага адзінства ў сярэдняй школе № 1. Гэты музей таксама наведалі ўдзельнікі мерапрыемства. За тры гады існавання музея ў ім было рэалізавана шэраг грамадзянскіх ініцыятыў, як накіраваных на патрыятычнае выхаванне дзяцей, так і на сувязь школы з навукай і вытворчасцю. Напрыклад, стварэнне ў школе тэхнапарка дзіцячых магчымасцяў было ініцыятывай гарадскога дэпутацкага корпуса. Дырэктар школы Марына Купцова паведаміла, што ўжо сёлета ў выніку ўдзелу ў адной з ініцыятыў школа выйграла грант па лініі маладзёжных ініцыятыў прафсаюзных арганізацый і атрымала 10 тысяч рублёў на развіццё інфармацыйнага асяроддзя.



## ІДЭЯ ПЛЮС ПРАЦОЎНЫ ЎДЗЕЛ

Другая секцыя семінара працавала ў Баранавіцкім раёне, дакладней, у вёсцы Моўчадзь, якая мае 600-гадовую гісторыю. Найперш ушанавалі памяць герояў і ахвяр вайны. У вайну ў мястэчку было арганізавана гета, яўрэяў звозілі сюды з усіх навакольных населеных пунктаў. У выніку знішчэння гета было забіта больш як 3800 чалавек. З вайны не вярнуліся 114 жыхароў вёскі. Пра трагічныя старонкі гісторыі расказваюць мемарыялы... А два гады таму, да 600-гадовага юбілею, Моўчадзь значна папрыгажэла. Такой зрабілі яе неабыякавыя людзі, якія працавалі на суботніках, садзілі і ўладкоўвалі скверы, рабілі малыя архітэктурныя формы. Цікавую экскурсію па храме Святых апосталаў Пятра і Паўла правёў настаяцель храма іерэй Іван Пашкевіч. Храм, дарэчы, нядаўна адзначыў 150-годдзе.

У Ляхавіцкім раёне дэпутаты і запрошаныя ўдзельнікі мерапрыемства вывучалі пытанне рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў на прыкладзе Навасёлкаўскага сельсавета. Па традыцыі ўдзельнікі нарады пакланіліся памяці воінаў, якія загінулі ў гады вайны. **Старшыня Ляхавіцкага раённага Савета Юрый ЧАРАНКЕВІЧ** расказаў, як ажыццяўляюцца ідэі актыўных грамадзян. Гэта, несумненна, спрыяе эканамічнаму, сацыяльнаму, культурнаму развіццю рэгіёна. Важнымі ўяўляюцца і невялікія ініцыятывы, як, напрыклад, абнаўленне агароджы на вясковых могілках, так і маштабныя, накшталт устаноўкі памятнага знака спаленым вёскам раёна. У кантэксце размовы пра апошні праект кіраўнік раённага дэпутацкага корпуса выказаў прапанову спрашчаць парадак рэалізацыі падобных ініцыятыў. Бо канкрэтна гэтая справа зацягнулася з-за многіх узгадненняў і вялікага кошту праектна-каштарысных работ.

У Навасёлках цэнтр аграгарадка ў апошнія гады літаральна пераўтварыўся дзякуючы ініцыятыве неабыякавых людзей і іх працоўнаму ўдзелу. На месцы былога запушчанага сквера з вялікімі дрэвамі з'явіўся прыгожы сучасны, з клумбамі, дэкаратыўнымі кустамі, малымі архітэктурнымі формамі. Пра тое, як шчыравалі вясковыя жыхары, спецыялісты сельгаспрадпрыемства «Шлях новы», работнікі сельскага Дома культуры над упрыгажэннем цэнтральнай часткі вёскі, расказаў **старшыня Навасёлкаўскага сельскага Савета Аляксандр МАЦЮШЭНКА.** Дарэчы, спецыяльна да семінара ў навасёлкаўскім скверы зладзілі выставу міні-макетаў гістарычных славутасцяў раёна. Гэта таксама мясцовая ініцыятыва, якую ўвасобілі ў жыццё навучэнцы школ Ляхавіцкага раёна. У паменшаным маштабе былі прадстаўлены храмы, палацы, фальваркі. А яшчэ дырэктар прадпрыемства «Аўтацэнтр Вікторыя» Віктар Шчука паказаў вынікі рэалізацыі ўласнай ініцыятывы — стварэння музея рэтратэхнікі. Адноўленыя першыя героі калгасных ніў — трактары, грузавікі — выклікалі асаблівую цікавасць гледачоў.



**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА** сказаў карэспандэнту газеты так:

— Сёння мы разглядаем на практыцы, як прымяняюцца і выконваюцца на месцах законы аб мясцовым самакіраванні і адміністрацыйных працэдурах. Гэтыя два законы, на мой погляд, вельмі адчувальныя для нашых грамадзян, бо накіраваны на павышэнне ініцыятывы мясцовых жыхароў па развіцці сваіх тэрыторый і на спрашчэнне працэдур, якія патрабуюць шматлікіх узгадненняў, шматлікіх запытаў. Служба «адно акно» для гэтага і стваралася. Па ініцыятыве нашай камісіі ў жніўні дэпутаты правялі маніторынг таго, як працуюць службы «адно акно». Сёння мы наведваем гэтыя службы ў гарадах і падводзім своеасаблівы вынік. На пленарным пасяджэнні прааналізуем праблемы ў дзейнасці службы.

А вось тут, у Навасёлках, мы ўбачылі сапраўдных гаспадароў, якія працуюць над паляпшэннем сваёй мясціны, калектыўна вырашаюць тыя праблемы, якія ўзнікаюць. Важна, што грамадзяне робяць гэта з падтрымкай сельскага Савета, мясцовага прадпрыемства, — пракаментаваў убачанае Валянцін Семяняка.

## ДЛЯ ПАЗІТЫЎНАГА НАСТРОЮ І ЗГОДЫ Ў ГРАМАДСТВЕ

Удзельнікі кожнай з секцый змаглі пазнаёміцца з работай службы «адно акно». Ведома, работа гэтай службы ў Баранавічах і Ляхавічах значна адрозніваецца, найперш маштабамі. Напрыклад, у Баранавічах штат службы налічвае восем чалавек: начальнік і сем вядучых спецыялістаў. У пачатку 2022 года служба пераехала ў асобнае памяшканне. Цяпер там усё абсталявана для зручнасці супрацоўнікаў і наведвальнікаў. Маецца асобны ўваход, зала для прыёму грамадзян, ёсць сектары чакання, інфармавання і абслугоўвання. Працуе электронная чарга з прыярытэтам на выдачу гатовых дакументаў. Забяспечана безбар'ернае асяроддзе для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Спецыялісты службы вядуць прыём па 191 адміністрацыйнай працэдуры і 19 пытаннях, якія не з'яўляюцца адміністрацыйнымі



працэдурамі. Прыводзіліся такія лічбы: за восем месяцаў гэтага года ў «адно акно» звярнулася больш за 22,8 тысячы грамадзян, што на 21 працэнт больш, чым за такі ж перыяд летась. Найчасцей звяртаюцца для рэгістрацыі дагавора найму жылога памяшкання прыватнага жыллёвага фонду і дадатковых пагадненняў да яго, пастаноўкі на ўлік дзіцяці для атрымання месца ў садку, а таксама для прыняцця на ўлік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Грамадзянам не трэба самастойна збіраць даведкі, патрэбныя для адміністрацыйных працэдур, усе дакументы замаўляе сама служба «адно акно». Цяпер з'явілася магчымасць падаць заяву аб ажыццяўленні адміністрацыйнай працэдуры з другога горада. Разглядаецца пытанне аб стварэнні яшчэ двух дадатковых рабочых месцаў у службе, бо наспела неабходнасць выдачы электронных лічбавых подпісаў.

У Ляхавічах таксама абсталявана памяшканне для службы «адно акно», выконваюцца ўсе асноўныя працэдуры, але працуюць у службе ўсяго два спецыялісты. Дэпутаты ў размове з імі акцэнтавалі ўвагу на праблемах. Скажам, калі адна з супрацоўніц захварэла, другой даводзіцца вельмі няпроста. І яшчэ адзін нюанс, характэрны для райцэнтра: у штаце выканкама няма такога падраздзялення — «адно акно». Адна з супрацоўніц з'яўляецца спецыялістам сектара па рабоце са зваротамі грамадзян райвыканкама, другая знаходзіцца ў штаце ЖКГ. Прапаноўвалася гэты момант урэгуляваць заканадаўча. Пры тым важна ўлічваць спецыфіку раёнаў, зыходзіць з таго, што служба павінна быць рэальнай, выконваць свае функцыі дакладна. Верагодна, яшчэ ёсць над чым працаваць і парламенцкай камісіі і профільнаму міністэрству.

***

*Пазней у размове з журналістамі Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергеенка расказаў, што работу службы «адно акно» дэпутаты вывучалі ў сваіх рэгіёнах на працягу ліпеня — жніўня: «Заканадаўчая база ёсць. Мэта вызначана — зрабіць так, каб чалавек не хадзіў па кабінетах чыноўнікаў, кіраўнікоў рознага рангу па патрэбны дакумент, а падаў заяву і атрымаў паперы ў адным месцы. Усё гэта функцыянуе ўжо некалькі гадоў, а вось якія ёсць недапрацоўкі, рэзервы, якія маюцца шляхі паляпшэння, удасканалення, будзем глядзець, у тым ліку, па выніках гэтага семінара».*

*Работа дэпутатаў па секцыях працягнулася на пленарным пасяджэнні. Ігар Сергеенка адзначыў, што паспяховыя праекты ёсць ва ўсёй краіне, але Брэсцкая вобласць была выбрана невыпадкова, бо тут ёсць што паглядзець, ёсць вопыт, які можна і пераняць: «Напрыклад, пры наведванні школы № 1 у Баранавічах многія дэпутаты былі прыемна ўражаны, нават узрушаны. Гэта, відаць, на сёння адна з найлепшых школ у краіне. І не толькі таму, што тут створаны першы ў Беларусі Музей народнага адзінства, яшчэ і таму, што разам даволі плённа працуюць педагогі, бацькі, грамадскасць горада, разам паспяхова рэалізоўваюць і развіваюць праекты на карысць навучальнага і выхаваўчага працэсаў.*

*Тэма фарміравання і рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў надзвычай важная, — адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Летась унесены змены ў закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, дзе зроблены ўдакладненні і падыходы да рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў. У гэтым годзе выдзелены сродкі з рэспубліканскага бюджэту. Часам ідэі, што зыходзяць ад грамадства, трэба падтрымаць матэрыяльна, у іншых выпадках энтузіястам дастаткова падтрымкі маральнай.*

*Не менш важнай падаецца і тэма службы «адно акно», бо абедзве тэмы разам накіраваны на паляпшэнне якасці жыцця грамадзян, служаць пазітыўнаму настрою людзей і згодзе ў грамадстве», — падсумаваў кіраўнік Палаты прадстаўнікоў.*

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

# КІРАЎСКАЯ ПАША АНГЕЛІНА

## Былая трактарыстка аграгаспадаркі «Рассвет імя К. Арлоўскага» Ніна Бяляўская нават у свае паважаныя 85 не сядзіць склаўшы рукі

**Для сельскіх дзяўчат пасляваеннага перыяду Праскоўя Ангеліна была прыкладам для пераймання — спрытная, ініцыятыўная, працавітая. Ніна Бяляўская з аграгарадка Мышкавічы Кіраўскага раёна, дзе не менш гучна грымеў на ўвесь Савецкі Саюз калгас-мільённік «Світанак» пад кіраўніцтвам легендарнага Кірыла Арлоўскага, практычна паўтарыла шлях знакамітай трактарысткі. У 18 гадоў яна села за руль трактара ДТ 20 і адпрацавала на ім болей чым 30 гадоў. У 1962 годзе ёй на рэспубліканскім пасяджэнні маладых механізатараў прысвоілі званне «Заслужаны механізатар БССР» і ўручылі залаты гадзіннік. А ў 1977 годзе яна стала ўладальніцай прэстыжнага прыза імя Пашы Ангелінай. У ліку найлепшых трактарыстак Савецкага Саюза яна была запрошана ў Маскву для ўручэння ўзнагароды ўсесаюзнага значэння. Прыз працоўнай славы ў выглядзе бюста Пашы Ангелінай на фоне сярпа і трох каласоў і цяпер займае ў яе хаце пачэснае месца. Разам з яго ўладальніцай паглыбляемся ў той час, калі моладзь актыўна ўлівалася ў стаханаўскі рух і ставіла рэкорды.**



### Тры захапленні Ніны Бяляўскай

Эпоха 50-х наклала на юную Ніну Цэд (яе прозвішча ў дзявоцтве) свой адбітак. Гэта быў перыяд індустрыялізацыі, росквіту кіно. І яе ўсё гэта натхняла. У калгасе «Рассвет» працавала, лічы, з дзяцінства, разам з аднакласніцамі пасля ўрокаў займалася праполкай, іншымі работамі. А з 17 гадоў цалкам перайшла на работу ў калгас. Працавала ў брыгадзе, а бачыла сябе на трактары. Паехала паступаць на трактарыстку ў Бабруйск, а ёй адмовілі. Сказалі, што ў іх хлопцаў хапае. Дзяўчына засмуцілася, але не здалася. Верыла, што будзе і на яе вуліцы свята. Вярнулася ў калгас і адводзіла душу з коньмі. Іх на той час там было вельмі шмат. Ёй давяралі перавозіць розныя грузы, бульбу абганяць.

— А верхам ездзіла так, што хлопцы дагнаць не маглі, — з гонарам кажа Ніна Архіпаўна. — Коні мяне вельмі любілі. Адзін з іх па мянушцы Камлюк наогул слухаўся толькі мяне, нікога з мужыкоў не прызнаваў. Аднойчы іду на работу, мужчыны сядзяць, смяюцца: «Сёння Ніне дадзім Барыкаду». Кабыла была вельмі агрэсіўная, кусалася. А я з ёй пагаманіла, аброць надзела — і Барыкада пайшла за мной. Іду, а мужыкі ў здзіўленні кажуць: «Глядзіце, яна і Барыкаду ўзяла». Думалі, што я ўцякаць буду, а я яе запрэгла.


УДОСТОВЕРЕНИЕ
ТРАКТОРИСТА-МАШИНИСТА ТРЕТЬЕГО КЛАССА
№ 038207
Цед
Нина

У 18 гадоў Ніна працавала ўжо на свінарніку. А пасля работы бегала глядзець кіно. Аднойчы каля афішы ўбачыла аб'яву: калгас запрашаў на трохмесячныя курсы для трактарыстаў. Прыбегла дамоў і танцуе: «Маці, тата, пайду на трактарыста вучыцца». Маці толькі плячыма паціснула: маўляў, што тут добрага — у мазуце хадзіць будзеш. А тата: ну, хоча, хай ідзе. Яны не ведалі, што старэйшы брат Аляксандр, які працаваў трактарыстам, ужо навучыў яе кіраваць тэхнікай. Яшчэ падлеткам яна бегла да яго ў поле, ён саджаў яе за руль і тлумачыў, што і як трэба націскаць. Курсы патрэбны былі Ніне, каб працаваць афіцыйна.

— Спачатку было цяжка: а палове чацвёртай на свінарнік уставала, да вечара там працавала, а потым бегла на курсы, дамоў вярталася ледзь не апоўначы, — расказвае яна. — На свінарніку загадчык шкадаваў мяне, бачыў, што не высыпаюся. Пагутарыў з Арлоўскім, каб мяне ў брыгаду перавялі. Там работы пазней пачыналіся.

Тое, што быць механізатарам пачэсна, Ніна адчула з першых дзён сваёй работы на трактары. Калі да Арлоўскага прыязджалі карэспандэнты, ён вёз іх у поле, каб паказаць сваю трактарыстку. Яна і іншых жанчын сваім прыкладам натхняла. Пасля яе яшчэ адна работніца села на трактар. За працавітасць і добрасумленнасць Ніну Бяляўскую вылучылі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. «Вельмі адказная місія была, ездзіла ў Мінск на сесіі», — успамінае суразмоўніца.

Кірыл Арлоўскі быў для калгаснай моладзі яркім прыкладам. Былы партызанскі камандзір, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы, ён заўсёды быў патрабавальны і да сябе, і да тых, хто працаваў з ім побач.

— У жыцці вельмі справядлівы быў і строгі, — успамінае Ніна Архіпаўна. — А палове чацвёртай раніцы ўстане, усю гаспадарку агледзіць, заўважыць, што не прыбрана, не дароблена. Прыйдзе, як дасць на разнарадцы брыгадзірам. Сам невялічкага росту, адной рукі не было, другая ледзь працавала — толькі распісацца мог, але дысцыпліну трымаў, усе яго слухаліся, баяліся. І вельмі паважалі. Калі мне прыз Пашы Ангелінай уручалі, папрасілі, каб я нешта пра яго расказала. Ён ужо з жыцця пайшоў, але яго ўсе помнілі і шанавалі. Я выйшла на сцэну, а эмоцыі так нахлынулі, што толькі расплакалася. Цяжка было казаць пра яго ў мінулым часе.




УДОСТОВЕРЕНИЕ
ЗА УСПЕХИ В НАРОДНОМ ХОЗЯЙСТВЕ СССР
Тов. Цед
Нина
Архиповна
ПОСТАНОВЛЕНИЕМ КОМИТЕТА СОВЕТА ВЫСТАВКИ ДОСТИЖЕНИЙ НАРОДНОГО ХОЗЯЙСТВА СССР
НАГРАЖДЕН(А)
МАЛОЙ СЕРЕБРЯНОЙ МЕДАЛЬЮ
Комитет совета ВДНХ


УДОСТОВЕРЕНИЕ
Товарищ Бяляуская Нина Архиповна
является победителем социалистического соревнования женщин-механизаторов в 1977 году за Всесоюзный приз трудовой славы имени П. Н. АНГЕЛИНОЙ


ПАСВЕДЧАННЕ № 7
ЗАСЛУЖАНАГА МЕХАНІЗАТАРА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР
Прозвішча Цэд
Імя Ніна
Імя па бацьку Архіпаўна
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
22 лютага 62
УДОСТОВЕРЕНИЕ № 7
ЗАСЛУЖЕННОГО МЕХАНИЗАТОРА СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА БССР
Фамилия Цед
Имя Нина
Отчество Архиповна

### Пакаленне працаўнікоў

У хаце Ніны Архіпаўны адчуваецца яшчэ тая эпоха. Мэбля савецкага перыяду, вышыўкі на сценах. Гэта яе рук справа. І калі толькі паспявала? Па іх можна здагадацца, якое месца ў яе жыцці займалі коні. Яны прысутнічаюць ледзь не на кожнай карціне. А яшчэ шмат кніг на палічках. «Дрэнна спала па начах, кнігі ратавалі», — усміхаецца яна. З шафы на нас глядзіць бронзавая статуэтка Пашы Ангелінай. Быццам нагадвае аб працоўных подзвігах сваёй гаспадыні. Былая трактарыстка вельмі ганарыцца, што яе працу так высока ацанілі.

— Я вельмі старанная была, — кажа яна. — Сеяла гектарамі. Працавала ад відна да відна. У абед нешта хуценька ў кабіне перахаплю — і зноў за руль. Сеяла кукурузу, гуркі, моркву, нават мак. Не ведала, што такое бальнічны, хоць аднойчы прыйшлося пару тыдняў дома пасядзець. Убірала гарох і авёс, як раптам дым з-пад капоту пайшоў, вада закіпела. Ведала, што нельга адразу яго адкрываць, але як хто за руку пацягнуў. Адкрыла — і гарачай парай апякло ўсю. Боль быў страшны. Але неяк прыехала на мехдвор, касілку паставіла, і дамоў на веласіпедзе памчалася. Пляменніца як убачыла мяне, спужалася. А я яшчэ на работу збіралася ісці. Яна стала на дзвярах — нікуды, крычыць, не пушчу. Прыйшлося дома пабыць, падлячыцца. Да спіны нельга было дакрануцца: агнём пякло...

У сямейным архіве Ніны Бяляўскай шмат цікавых фота, дзе яна на трактары, на ўзнагароджванні ў Маскве, сярод моладзі, дэпутатаў. На сцяне — партрэты, зробленыя фотакарэспандэнтам часопіса «Сялянка», які пісаў пра подзвігі маладой механізатаркі.

— Вас не бянтэжыла, што ўвесь час даводзілася ў пыле працаваць, грукаце? — цікаўлюся ў стаханаўкі.

— Мне падабалася, я і працавала. Сяброўкі смяяліся, што я як мужчына ў штанах на трактары. Гэта цяпер жанчыны ўвесь час у штанах, а тады толькі сукенкі насілі. І я сукенку адзела. Злазіла з трактара, ды і зачапілася ёй за жалезку. Нагамі зямлю дастаць не магла. Шмаргала спадніцу, пакуль не парвалася. З таго часу больш сукенку на работу не адзявала.

— Напэўна, за цяжкую працу і плацілі добра?

— Для мяне гэта не было галоўным. Я грошы наогул не лічыла. Толькі калі сям'я з'явілася, дзеці пайшлі, стала гэтаму ўвагу ўдзяляць.

— Муж таксама быў трактарыстам?

— Спачатку ён у брыгадзе працаваў. А калі са мной пазнаёміўся, паехаў у Бабруйск і тры гады вучыўся на трактарыста. З суседняй вёскі да мяне на спатканні прыязджаў на веласіпедзе. Ён таксама са шматдзетнай сям'і, бацька на вайне загінуў. Калі сказаў маці, што са мной збіраецца ажаніцца, яна спачатку супраць была. Я ж незалежная, увесь час працавала ў мужчынскай кампаніі. Некаторыя людзі прыдумвалі пра мяне ўсякія небыліцы. Жаніх мой Антон упэўнены быў ува мне, а вось яго маці да апошняга сумнявалася. Толькі калі з бацькамі маімі пагутарыла, памякчэла.

— А як выхадныя праводзілі, святы?

— Якія яшчэ выхадныя, нават на Вялікдзень працавала, у нас пасяўная была. А цэрквы ў раёне разбурылі яшчэ пры Арлоўскім. З рэлігіяй так змагаліся. І святамі асабліва не цікавілася. Не было на гэта часу. Нават на танцы не хадзіла, толькі ў кіно. І тое да таго, як замуж выйшла. Дома трымала свіней, карову, птушку. Тады ва ўсіх гаспадарка была. Першынца свайго ледзь не на трактары нарадзіла. Тры месяцы пабыла ў дэкрэце — і на работу. Такой раскошы, як сёння — тры гады з малым сядзець, — не было. Бабуля дзіця дагледала.

— З якімі пытаннямі да вас звярталіся як да дэпутата?

— Глабальных праблем не вырашала, але нікому не адмаўляла ў дапамозе. Аднойчы ў поле працавала, а да мяне жанчына прыбегла. Плача, што муж за ёй з нажом ганяўся. Патэлефанавала ў Кіраўск у міліцыю, прыехаў нарад і прыструніў яго.

### «Баба за рулём?»

У савецкі час убачыць жанчыну за рулём легкавой машыны было дзіўна. І Ніна Бяляўская па тых часах была больш выключэннем, чым правілам. Калі стала дэпутатам, мела магчымасць без чаргі набыць матацыкл К-750. Трэба было шмат круціцца па справах. Потым прыдбала «Ладу 2101». Вельмі хацела мець уласны аўтамабіль. Кожную капейку на ашчадную кніжку клала. Машыну ў Бабруйску купляла. Калі прыехала на той аўтарынак, вочы разбегліся. Як толькі ўбачыла чырвоную машыну, падбегла да яе і адразу ж аб'явіла: «Мая». Яна была першая жанчына ў раёне, якая села за руль свайго аўто. З усмешкай расказвае, што хацела неяк мясцовую жыхарку падвезці, а тая як убачыла яе за рулём, толькі адмахнулася: «Вой, баба за рулём? Не, не паеду».

На сваёй «капеечцы» Ніна Архіпаўна шмат гарадоў аб'ехала. Была ў Закарпацці, вазіла сям'ю ў госці да сватоў сястры. І ў Мінск ездзіла да брата мужа, і па Мінску. Успамінае, што настолькі ўпэўненая была ў сабе і машыне, што нічога не баялася.

Ніна Архіпаўна і сёння ўся ў дзеянні. Пакуль маладыя суседзі спяць, яна ўвесь свой агарод абыдзе, парадак навядзе, птушку пакорміць. Не прывыкла сядзець склаўшы рукі. «Наша пакаленне не шукала сабе ні лёгкага хлеба, ні лёгкіх дарог. Бо самае дарагое, самае цудоўнае ў нашым жыцці — гэта самааддадзеная праца на карысць любімай Радзімы». Гэтыя словы Пашы Ангелінай, пазначаныя на прызе, сталі для Ніны Бяляўскай дэвізам жыцця.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*Кіраўскі раён.*

### У тэму

**Намеснік дырэктара ААТ «Рассвет імя К. Арлоўскага», намеснік старшыні Кіраўскага райсавета Наталля ШАПАВАЛАВА:**

— Сёлета гаспадарка адзначае 80-годдзе свайго існавання. Працоўныя традыцыі вельмі вялікія. Яны былі закладзены яшчэ Кірылам Арлоўскім. Удзяляем вялікую ўвагу дынастыям, якія ў нас працуюць, яны прыклад для маладога пакалення. У нас цяжэй працаваць, бо большыя аб'ёмы, але і ганарова. «Рассвет» на слыху. У аснове ляжыць вялікая праца. І такія прыклады як наша Ніна Архіпаўна, дапамагаюць зразумець, што для таго, каб чагосьці дасягнуць у гэтым жыцці, трэба самааддана працаваць.

# Каб турыстам было цікава

## Як у Геранёнах развіваюць гістарычную спадчыну

**Аграгарадок Іўеўскага раёна вабіць сваёй сярэднявечнай гісторыяй. З гэтым месцам звязана жыццё знакамітай Барбары Радзівіл — таямнічай Чорнай Панны. Да сённяшняга дня дайшоў старажытны касцёл тых часоў і рэшткі былога замка. У сельскім савеце з гэтымі славутасцямі звязваюць павялічэнне турыстычнага патоку праз аграгарадок. Аб тым, як можна затрымаць гасцей і чым прывабіць, расказаў старшыня сельсавета Віктар ВЕРШАЛОВІЧ.**






Геранёны — першы прыпынак турыстычнага маршруту па паўночным кальцы Гродзенскай вобласці. У аграгарадку па выхадных спыняюцца па 3-4 аўтобусы са сталічнымі гасцямі. Турыстычныя фірмы рыхтуюць сваю праграму з сярэднявечным ухілам. Геранёны ў гэтым кантэксце маюць вельмі кранальную і таямнічую гісторыю.

Як сведчыць паданне, у паселішчы стаяў велічны замак, які ў XV — XVI стагоддзях лічыўся адным з самых прыгожых у Вялікім Княстве Літоўскім. Менавіта тут і разгарнулася драматычная гісторыя кахання караля Сігізмунда Аўгуста II і Барбары Радзівіл, якая на момант іх сустрэчы жыла ў Геранёнах пасля смерці яе мужа — уладальніка замка. Некалькі гадоў кароль прыязджаў сюды для сустрэч з прыгожай шляхцянкай. Потым яе назавуць Чорнай Панной, якая не мае прытулку і з'яўляецца праз стагоддзі як маўклівы прывід. Але гэта ўжо іншая гісторыя.

Замка таго велічнага за пяць стагоддзяў у Геранёнах не захавалася, засталіся толькі рэшткі. Доўгі час іх складана было заўважыць сярод хмызоў. Мясцовыя ўлады месца расчысцілі, цяпер замчышча законсервавана.

— Гэта месца заўсёды прыцягвала турыстаў. Аднак апошнім часам іх колькасць значна павялічваецца. Таму было прынята рашэнне добраўпарадкаваць тэрыторыю, зрабіць поручні, каб было зручна любавацца рэшткамі замка і ўспамінаць прыгожую гісторыю кахання з сівой даўніны, — расказвае Віктар Вершаловіч. — Побач устанавілі інфармацыйныя шчыты, дзе можна даведацца аб нейкіх гістарычных падзеях. Плануем гэта месца развіваць і надалей.



Хочацца, каб турысты пасля яго наведвання змаглі завітаць у мясцовую ўстанову культуры, палюбавацца выставамі народных майстроў, пагуляць па аграгарадку.

Дарэчы, у культурным плане месцічам таксама ёсць што прапанаваць турыстам. У Геранёнах працуе знакаміты майстар па саломапляценні Юзэфа Старасціна, якая загадвае сектарам рамёстваў і традыцыйнай культуры ў аграгарадку. Работай з саломкай займаецца больш чым 30 гадоў. Яна як народны майстар мае шмат узнагарод, з'яўляецца лаўрэатам прэміі «Чалавек года Гродзеншчыны», удзельнічае ў абласных і рэспубліканскіх фестывалях і кірмашах. Таксама культурнай візітоўкай з'яўляецца ансамбль народнай песні «Вечарына» аддзела культурна-масавай і асветніцкай работы аграгарадка Геранёны Іўеўскага цэнтра культуры і вольнага часу.

— Мы можам сустракаць групы каля замчышча, даваць прадстаўленні, потым запрасіць у музей, там правесці майстар-клас па саломапляценні, даць урок старадаўніх танцаў. Цяпер вядзём падрыхтоўчую работу ў гэтым кірунку, — зазначыў старшыня сельсавета.

Таксама ў планах мясцовай улады яшчэ некалькі праектаў. Самым маштабным тут лічаць добраўпарадкаванне старога парку на тэрыторыі былога замка. Дарэчы, тут засталіся і рэшткі старажытных абарончых валоў XIX стагоддзя вышынёй да дзесяці метраў. У сельвыканкаме вырашылі пакласці ўздоўж іх экалагічную сцежку на некалькі кіламетраў. Тэма цікавая і вартая конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Важную ролю ў гэтым адыгрываюць і мясцовыя жыхары. Дарэчы, яны кожны год збіраюцца на ачыстку тэрыторыі, прыводзяць у парадак былую паркавую зону. Але сродкаў на больш грунтоўныя работы пакуль недастаткова.





— Мы за гэты час многае прыбралі, цяпер тут акуратна, але хочацца зрабіць гэтае месца прывабным для адпачынку. Тут прыйшліся б дарэчы і мосцікі, і дарожкі, і альтанкі, і лаўкі, але пакуль няма сродкаў. Між тым мы не стаім на месцы і хочам сумясціць замак з цэнтральнай плошчай у Геранёнах, спалучыць гісторыю і сучаснасць, — паведаміў Віктар Вершаловіч.

Яшчэ вясной па ініцыятыве дэпутата Геранёнскага сельскага Савета, загадчыка мясцовай установы культуры Галіны Дзіц у аграгарадку правялі вялікую акцыю «Упрыгожым свой дом самі», якую актыўна падхапілі ўсе жыхары населенага пункта. Першым яе этапам стала правядзенне суботніка на замчышчы, а другім — пасадка сквера Дружбы ў цэнтры Геранёнаў. На гэтыя мэты было закуплена 80 туй, якія высаджвалі цэлымі сем'ямі.

Відавочна, што турыстычная галіна — адна з даходных частак бюджэту пры арганізацыі адпаведных інтэрактыўных мерапрыемстваў. У Геранёнскім сельскім Савеце на гэты аспект звяртаецца пільная ўвага. Тым больш што з гэтым месцам звязана такая захапляльная легенда, тут на свае вочы можна ўбачыць рэшткі замка, дзе жылі прадстаўнікі каралеўскага роду. Больш за тое, непадалёку захавалася і былая капліца замка, а цяпер касцёл Святога Мікалая, які пабудаваны яшчэ ў 1529 годзе. Гэта самы старажытны храм на тэрыторыі Іўеўскага раёна. За сваю гісторыю ён неаднаразова рамантаваўся і перабудоўваўся, у тым ліку пасля вялікага пажару ў сярэдзіне XVIII стагоддзя. Цяпер храм у добрым стане, адкрыты для вернікаў і турыстаў. Побач знаходзіцца званіца XIX стагоддзя, цэнтральны ўваход упрыгожвае старажытная брама.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 11.437. Нумар падпісаны ў 19.30 1 кастрычніка 2024 года.**

# «І КОРШАК БЫЎ ДЛЯ МЯНЕ ВОСЕННЮ...»

## Восеньскі лес на старонках літаратурных твораў

**Толькі што мы наракалі на спёку, здавалася, нібыта яна так і будзе далей нас мучыць... Аж не, прыроду не спыніць, не замарудзіць, і вось ужо вечары халаднеюць, зоры буйнеюць, як спелыя яблыкі, і гэтак жа ападаюць у сухую траву, лістота страчвае зялёны колер... Найлепей назіраць за тым, як прыходзіць восень, у лесе. Няма, мабыць, мастака і паэта, якія б не натхняўся відамі восеньскага лесу. Здавалася б, усе бачаць адну і тую ж карціну — але ж якая яна ў інтэрпрэтацыі аўтараў розная, напоўненая сваёй сімволікай... Давайце разам пройдземся восеньскім лесам на старонках твораў беларускіх пісьменнікаў.**



### А ЯК ПРЫЙДЗЕ ВЯСНА — ЎСЁ АДМЕНІЦЦА

Янка Купала ў вершы «Лістапад» зашыфраваў не проста звяданне прыроды ўвосень — а звяданне надзей людскіх у неспрыяльныя часы... І не забыўся нагадаць чытачу, што вясна прыйдзе абавязкова, таму не варта маркоціцца. Такі вось спрадвечны аптымізм таго, хто верыць у свой народ:

*«З буйных ліп і бяроз*
*Лісты валяцца.*
*Між павалаў і лоз*
*Рассыпаюцца.*
*Шапацяць, шалясцяць*
*Залацістыя,*
*Ўвысь галінкі глядзяць*
*Пусталістыя.*
*А як прыйдзе вясна —*
*Ўсё адменіцца,*
*І галінкі ізноў*
*Зазяленяцца».*

### «ТАК ПЕРАД БУРАЙ МАЎЧАЦЬ ДУБЫ Ў ЗАДУМЕ СІНЯЙ...»

Янку Брылю давялося пажыць у Заходняй Беларусі, акупаванай панскай Польшчай. Тэма змагання беларусаў супраць прыгнёту акупантаў стала для яго магістральнай. Не дзіва, што і ў коле ягоных сяброў было шмат удзельнікаў таго змагання, такіх як паэты Міхась Васілёк і Валянцін Таўлай. У кнізе мініяцюр «З людзьмі і сам-насам» Янка Брыль цытуе верш Васілька, у якім паэт прыпадабняе лясныя дрэвы людзям з рознай грамадзянскай пазіцыяй:

«Перачытваючы Караленкава «Лес шуміць», успомніў Васілька — яго чатырохрадкоўе з моцным заключным радком:

*Калі насоўваецца мрок пануры,*
*Ад сполаху дрыжаць адны асіны.*
*Мы не дрыжым!.. Так перад бурай*
*Маўчаць дубы ў задуме сіняй...*

Гэтую мініяцюру Міхасю вырэдагаваў з даўжэйшага верша Таўлай. Пры маёй дапамозе. Пры аўтару. Захапляліся ўдачай разам, утрох».

### «РАЗУМЕЦЬ ЖЫВЫ ГОЛАС ПРЫРОДЫ, ШУМ ВЕТРУ, КРЫК ПТУШКІ»

У рамане Леаніда Дайнекі «Запомнім сябе маладымі» апісваецца Беларусь часу Першай сусветнай вайны і рэвалюцыйных падзей. Адзін з галоўных герояў, доктар з вялікага горада, пасяляецца ў палескай вёсачцы, дзе з дапамогай мясцовай сціплай красуні адкрывае для сябе цудоўную беларускую прыроду. Вось ягоная сяброўка, простая вясковая кабета, вядзе яго на балоты, у журавіны:

«Восеньскі лес быў сцюдзёны, туманны і шматфарбны. Холад быў разліты па лесе, павуціна, мокрая ад ранішняга туману, абчапляла ўсе кусты і дрэвы, перапляла ўсе сцяжынкі, і падумалася, што прабег тут ноччу сярдзіты паранены звер і ўсюды пакінуў шматкі сваёй белай сцюдзёнай поўсці. Адзінокія птушыныя галасы няўтульна гучалі ў гэтым урачыстым халодным маўчанні, якое перад прыходам зімы ўсё глыбей і глыбей агортвала лес...

Выйшлі на журавінавае балота. Мяккія белыя купіны, падобныя на вялізныя падушкі, былі раскіданы між чэзлага крывабокага хвойнічку. Ногі правальваліся па калена ў жоўта-буры мох, і пад мохам гулка чвякала вада».

Упершыню доктару Барысу Аляксеевічу давялося збіраць журавіны, упершыню пабачыў ён цецерукоў, упершыню прыйшло да яго адчуванне сапраўднасці жыцця:

«Якое шчасце — жыць... — шукаючы скалелымі пальцамі паміж шорсткага моху журавіны, думаў Барыс Аляксеевіч. — Блукаць вось па гэтым лесе, па гэтым балоце. Глядзець на зямлю і разумець яе. Разумець жывы голас прыроды, шум ветру, крык птушкі. Вось гэтую балотную купіну я ніколі не бачыў і, вядома ж, ніколі не ўбачу пасля сённяшняга дня, а для нейкіх жывых істот, для божых каровак, для стракоз, для цецерука з хвастом-лірай, для вужа, які, пэўна ж, ужо кладзецца спаць на зіму вунь пад тым струхлелым карчом, яна — цэлы Сусвет. Якое шчасце жыць і ведаць гэта».

### МУХАМОРЫ БЫЛІ КРЫВАВЫЯ

У апавяданні Уладзіміра Караткевіча «Кніганошы» лес робіцца фонам драматычнага сюжэта: у дзевятнаццатым стагоддзі сяляне-кніганошы носяць праз мяжу забароненую літаратуру. Носяць, часам не ўмеючы самі чытаць, але ведаючы, што кніга — гэта святло. Аўтар памайстэрску насычае пейзаж восеньскага лесу мастацкімі дэталямі, якія настройваюць чытача на будучы крывавы фінал: стары кніганоша, каб не быць злоўленым жандарамі, саскочыць з адхону. Таму рупчаіны ў гэтым лесе чорныя, лапнік сівы, мухаморы крывавыя, і нават з рыжыкаў з'яўляецца рудая кроў.

«...У сасновым лесе — маліцца, у бярозавым — любіцца, у дубовым — волю каваць, у яловым — душу д'яблу прадаваць.

Гэты лес быў яловы.

Ён цягнуўся амаль на сорак вёрст, і ўсе гэтыя вёрсты шумелі верхавінамі і маўчалі ўнізе, дзе былі сухія замшэлыя галіны, сівы лапнік, рэдкія галявіны з імшарамі ды куп'ём і чорныя ручаіны.

Усё тут расло цяжка, змагаючыся за кожны глыток паветра, за кожны прамень, і таму мухаморы былі крывавыя, а з абсыпаных гліцай рыжыкаў, калі збіць іх нагою, таксама тачылася рудая кроў».

### ГРЫЎКІ ЗРУДЗЕЛАГА БЯРЭЗНІКУ

Раман Васіля Быкава «Аблава» распавядае пра лёс бязвіннa рэпрэсіраванага селяніна, якому ўдалося ўцячы, і вось ён вяртаецца дадому. А куды ж яшчэ? Хіба ў родным лесе, у роднай хаце не будзе ратунку? Але там толькі гібель. На «ворага народу» аб'яўляюць сапраўдную аблаву. А пакуль, на пачатку рамана, герой разглядае знаёмыя мясціны і поўніцца ўспамінамі:

«Прырэчная лугавая імшарына з раскіданымі па ёй бухматымі купкамі лазняку ды грыўкамі зрудзелага бярэзніку дружна зеленела позняю восеньскай атавай. У доле скрозь было мокра, няўходна, мох часам асядаў пад нагамі, і тады з-пад яго цвіркала мутная жыжа. Але мох дужа не правальваўся, дрыгвы тут не было. Гэта цяпер, увосень, імшарына набрыняла вадой і стала падобнаю на балота, а ўлетку, у пару сенакосу, дык тут скрозь было суха, вольна хадзілі касцы, бабы і нават ездзілі на брыках, калі звозілі сена. Дзе-нідзе ў доле яшчэ і цяпер налітыя чорнай вадой блішчэлі сляды конскіх ног. Пасля дажджоў прырэчнае балота шырока разлілося, заліло імшарыну, якая, бы цеста на дражджах, пачала пухнуць мяккім вільготным мохам».

### ЗЯЛЁНКІ НА ЖАЎТАПЁСАХ

Герой рамана Івана Навуменкі «Развітанне ў Кавальцах» — тыповы прадстаўнік пакалення, якое Міхась Стральцоў трапна назваў «сена на асфальце». Колішні вясковы хлапчук, які прыжыўся ў горадзе, атрымаў адукацыю, адвык ад сялянскага побыту — але ўсё яшчэ дарагая ягонаму сэрцу вёска і цягнуць родныя мясціны.

«Я іду ў лес. Восень няўстойлівая: у канцы верасня выпадаў снег, у кастрычніку былі прымаразкі. Дажджы сталі церусіць перад самымі святамі. Жыццё ў лесе ўсё ж не замерла. У сасонніках па жаўтапёсах, імхах там-сям пракідаюцца зялёнкі, вялікімі сем'ямі растуць кволыя, някідкія на выгляд грыбы — цёмныя каптурыкі на тоненькай ножцы — у нашай мясцовасці іх называюць куркамі. Яшчэ нават познюю кветку можна напаткаць: свеціцца сіняе ці жоўтае вочка, і цяжка растлумачыць, як гэтая далікатная раслінка вытрымала замаразкі.

Між соснамі і ў лагчынах туман. Ён шчыльны, густы, але на вачах рассейваецца. Можа быць сонечны дзень.

Добра ў лесе — нават у такім вось асеннім. Будзённы клопат, надакучлівыя думкі сплываюць, дыхаецца, думаецца лёгка. Уся істота як бы яднаецца са святочнай урачыстасцю і спакоем, які тут пануе. Прыемна бачыць усё, што трапляе на вока: ядлоўцавыя кусты — яны амаль заўсёды суседнічаюць з мурашнікамі, пясчаныя пляшыны прагалін, камяні-валуны, парослыя па баках зялёным мохам».

### «І ПЕСНЯ ПРЫЛЯТАЕ ДА МЯНЕ»

А вось для «палескай ластаўкі» Яўгеніі Янішчыц лес, які губляе першыя жоўтыя лісці, — крыніца натхнення. Паэтэса там не проста блукае — пасяляецца, каб перапоўніцца пачуццём свабоды і прыгажосці:

*«Прыносіць мне дары свае дуброва —*
*То верас, то крыніцу, то грыбок.*
*Ўліваецца, нібы ручай, у мову*
*Палескі нетаропкі гаварок.*

*Злятае па дасвецці галубіным*
*То рыжы ліст, то жоўта-залаты.*
*Упалі задуменна на платы*
*Даспелыя ружовыя рабіны.*

*Хаджу па нівах, па лугах азёрных,*
*Начую летуценна ў будане.*
*Я думаю, чаму мне так прасторна?*
*І песня прылятае да мяне».*

### ВОСЕНЬ НАД ЮСТЫНАВАЙ ГАРОЙ

Паэт Віктар Шніп таксама вырас у вёсцы і таксама настальгуе часта ў сваіх творах па вясковым дзяцінстве, па цудоўных краявідах. У кнізе «Заўтра была адліга — 3», дзе спалучаюцца дзённікавыя запісы і вершы, ёсць такая мініяцюра:

«Вечар. Акно занавесіў. Уключыў святло. Адпачываю ад тлуму. Ластаўкі ў двары папіскваюць, нібыта напамінаюць, што яшчэ лета. А лета толкам яшчэ і не было. А восень ужо недзе за гарой. А ў нас у вёсцы Юстынава гара. І, калі мама казала, што ўжо восень за гарой, я ішоў на Юстынаву гару і глядзеў на лес, што быў за гарой. Глядзеў доўга, пакуль не ўгледжваў над лесам коршака. І коршак быў для мяне восенню. Чаму коршак? Не памятаю. А цяпер прыдумляць няма жадання. Яшчэ сёння было лета».

Не прамініце ж палюбавацца цудоўнымі восеньскімі пейзажамі, бо родная прырода не губляе свайго харастра ні ў якую пару. А разгледзець гэтае харастро нам якраз і дапамагаюць майстры слова, якіх варта чытаць і перачытваць.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «ВИСТАН» 210627, г. Витебск, ул. Димитрова, 36/7, тел. 8 (0212) 608605.

**Лот № 1.**
**Изолированное помещение с инв. № 200/D-122735,** площадью 1331,4 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36-9, наименование – изолированное помещение № 9, назначение – производственное помещение.

**Нач. цена: 302 400,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Задаток: 30 240,00 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения торгов: 06.11.2024 в 12.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 03.10.2024 с 08.30 по 05.11.2024 до 17.30.**

Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901.

**Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона, и расходы Продавца на проведение независимой оценки; заключить договор купли-продажи предмета аукциона в течение 15 рабочих дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы Продавца на проведение независимой оценки по лоту № 1 – 270,00 бел. руб. с НДС.

**Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск.язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид.предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

**Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.** Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. **+375 (25) 5155676,** Шевеленко Галина Владимировна.

## ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует

В извещение о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «МЗОР»,** опубликованном в газете «Звязда» от 01.10.2024, вносятся изменения: **«Дата и время проведения аукциона: 15.10.2024 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512, ЗАО «Центр промышленной оценки».** Дата и время окончания приема документов: 14.10.2024 до 17.00 по тому же адресу»

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06.<br>E-mail: auction@cpo.by. Сайт: www.ipmtorgi.by** |

УНП 191021390

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агрокомбинат «Скидельский»

**Аукцион состоится 16.10.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инвентарный № 412/С-87273 (целевое назначение – здание специализированное коммунального хозяйства 2 29 16, наименование – здание центральной котельной), общей площадью 134,0 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, аг. Хартица, ул. Ленина, 16Г.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 424081702101000578 площадью 0,0323 га, (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания центральной котельной), расположенном по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, аг. Хартица, ул. Ленина, 16Г. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2,4, площадь – 0,0323 га.<br>**Условия аукциона:**<br>- оплата капитального строения должна быть внесена в течение 90 (девяносто) календарных дней с даты заключения договора;<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору;<br>- переход права собственности и передачи капитального строения осуществляется после государственной регистрации сделки;<br>- расходы по удостоверению договора купли-продажи капитального строения в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» несет покупатель;<br>- обязанности подписания и подачи в РУП «Гродненское агентство по государственной регистраций и земельному кадастру» заявление о государственной регистраций и документов, необходимых для осуществления государственной регистраций договора купли-продажи, и основанного на нем права собственности на капитальное строение возлагается на покупателя;<br>- по соглашению сторон отчуждаемое капитальное строение до полного расчета будет находится в залоге ОАО «Агрокомбинат «Скидельский.<br>Обременений со стороны третьих лиц не имеет |
| **Начальная цена продажи** | 4 080 руб. (четыре тысячи восемьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 408 руб. (четыреста восемь рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 14.10.2024 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 06.10.2023 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 4б, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2. УНП 200100328 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 4б, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронного аукциона** (одним лотом) | |
| **Склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, **514,9 кв. м,** инв. №: 500/С-13011808) и **наблюдательный пункт (проходная)** (здание неустановленного назначения, **13,5 кв. м,** инв. № 500/С-13011809).<br>Адрес: **г. Минск, ул. Веры Хоружей, 25/10, 25/11** | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0808 га** предоставлен на праве аренды (срок действия по 31.01.2050) для эксплуатации и обслуживания производственных зданий и сооружений. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранные зоны электрических сетей (пл. 0,0040 га) | |
| ***Обременение:*** площади склада частично сданы в аренду | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 654 074,62 бел. руб.**<br>Шаг аукциона: 5 % от текущей цены | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 05.11.2024 с 11.00 до 12.00.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие принимаются по 04.11.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

## Извещение об открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 5 ноября 2024 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Янки Мавра, 30, микрорайон «Заболоть», У-401, 440100000002006905 | 0,0970 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. Фундамент: монолитный; площадь застройки: 164 кв. м, готовность: 11 % | 36 038,24 (8 781,24; 27 257,00) | 353,64 | 7 200,00 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260.

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы; заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**До подачи заявления физическому лицу необходимо открыть и/или иметь при себе открытый текущий (расчетный) счет, предварительно ознакомиться с условиями оплаты вознаграждений банку за оказанные услуги (перечисление и возврат суммы задатка), и предоставить необходимые реквизиты.**

**Аукцион состоится 5 ноября 2024 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 7 октября по 30 октября 2024 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу РБ http://gki.gov.by/ru/auction-auinf_object/, Гродненского областного исполнительного комитета http://region.grodno.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, ГП «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

# «БАЯНІСТ, ПАДОБНА, АС!

## Ці ў тым месцы? Ці ў той час?..»

**Для пачатку — чыстая праўда (гэта ў Аўцюках яшчэ і чыстая брахня бывае). «У нашай вёсцы ў 70-х гадах мінулага стагоддзя, — піша спадарыня Кусянкова з Рагачоўшчыны, — пракладвалі водаправод, капалі траншэі. І ў адну з іх — пад два метры глыбінёй — па дарозе з вяселля гарманіст уваліўся... Добра «мякнуўся», але ж нічога такога не пашкодзіў (дзецям і п'яным, кажуць, бог саломку падсцілае): чалавек і «гірмоніі» пры сабе абмацаў, і пляшку, што з сабою далі, а потым і... «сцены» па баках, і пясочак знізу...**

**— Усё, гэта канец. Зараз «прызавуць», — вырашыў дзядзька.**

**А пакуль — для храбрасці — прылажыўся да пляшкі, узяў у рукі гармонік і зайграў, заплакаў-завыў развітальную: «Последний нонешний де-е-не-ечек гуляю с вами я, друзья...»**

**— Гэта ты, Васіль? — спытаў нехта зверху.**

**Музыка з той нечаканасці аж «гірмоніі» выпусціў: падумаў, што «прызываюць», але чамусьці — голасам Ганны з суседняй вуліцы.**

**— Ты што — таксама памерла? — пытаецца ў жанчыны.**

**— З чаго б гэта? — крыўдзіцца кабета. — Я кароўку выйшла даіць...»**

І сапраўды, мусіць, зарана ўстала, самай першай пачула «з-пад зямлі» не тое песню, не тое плач...

Драбіны прынесла. Падняла чалавека. І не з траншэі, — з таго свету, можна сказаць. Не дзіва, што ён ёй «барыню» зайграў — у пяць гадзін раніцы».

...Што і для каго іграе музыка са здымка (можна яшчэ раз глянуць на верхні)? Чаму на вуліцы? Умеючы ці не ўмеючы? Адказаў (то-бок варыянтаў подпісаў) у пошуце шмат. Чытайма.

«Як чалавек пераважна вясковы, — піша **спадарыня Раіса Ісакава з в. Сласцёны Чавускага раёна**, — я не часта бачыла, слухала вулічных музыкаў. А таму з нагоды скажу толькі адно:

*Баяніст, падобна, ас!*
*Ці ў тым месцы?*
*Ці ў той час?*
*Каб дзе ў вёску...*
*І туды, у мінулыя гады...*
*Так спявалі б, так скакалі,*
*Што падэшвы адарвалі б!*

Цалкам магчыма, бо, паводле **спадара Янкава з Мінска**:

*На гукі музыкі заўсёды*
*Людзей цягнула на сяле...*
*Ды толькі шкода,*
*як жа шкода —*
*Што гэткі талент —*
*не ў мяне!*
*А то спяваў бы песні, вершы*
*Цікавым быў бы, дарагім,*
*І для дзяўчатак —*
*самым першым,*
*А так... то сёмым,*
*то другім...*

Кажуць, з імі, тымі дзяўчатамі, маладзіцамі, жанкамі — як з апаратамі мабільнай сувязі: альбо занятыя, альбо недаступныя, альбо «недастаткова сродкаў на вашым рахунку». Дык вось якраз тады:

*Калі пенсія малая,*
*Жонка з дому выганяе:*
*На баяне грае дзед,*
*Каб папоўніць свой бюджэт.*

Трэба разумець, паспяхова?

На думку **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска**, не заўсёды:

*Быў музыка сыты-п'яны,*
*Як вяселлейкі гудзелі.*
*А цяпер каля кавярні*
*Хоць японцы ды падпелі.*
*Мо адлічаць потым енаў?*
*Дзядзька шапку не здымае:*
*Чалавек ён хоць і бедны*
*Ды заўсёды гонар мае.*

Здаецца, пра яго, чалавека з гонарам, і радкі **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**:

*Хтосьці таленты шукаў*
*Ледзьве не са свечкамі...*
*Дзядзька Вася выглядаў*
*Блудню авечкаю:*
*Так наяраў! Гэтак пеў, —*
*Слухаў кампліменты.*
*Трохі большага хацеў*
*Чым апладысменты...*

Эстонская прымаўка: грошы не тое, што табе прапануюць, — што ў рукі даюць. (З дыялогаў. Дачка матулі: «Так, ён зарабляе пяць тысяч у месяц, але ён тоўсты, лысы, непрыгожы». Маці: «Ты няправільна гаворыш, дачушка. Трэба казаць: «Так, ён лысы, тоўсты, непрыгожы, але зарабляе пяць тысяч у месяц!»)

Вы мяркуеце, што не ігрой на баяне?

А гледзячы, як іграць?

Адзін музыка дома паспрабаваў... Назаўтра ўсяму свету хваліўся, што, каб лепей чуваць было, нехта каменем шыбу ў акне разбіў.

Бываюць арыгіналы. Адной дзеўцы-прыгажуні пашчасціла ці не залатога шчупака злавіць. Той — напрамілы бог: «Адпусці... А я за гэта тры любыя жаданні выканаю». Не паверыла рыбачка, але ж і не змаўчала: «Хачу, — кажа, — каб у мяне былі вялікія вушы». Апомніцца не паспела: ёсць! «Загадвай далей», — прапануе шчупак. «Хачу больш нос, — кажа дзяўчына. — І каб вочы па яблыку».

Выканаў шчупак гэтыя жаданні. Дзеўка-каракаціца адпусціла яго: мог бы ў ваду і з канцамі... Аж не: трохі адплыў ды назад вярнуўся. Галаву з рэчкі высунуў і кажа, што ніколі яшчэ такіх жаданняў не выконваў, што людзі звычайна просяць добрага сужэнца, багацця... «А што — гэта можна было?» — ашаломлена спытала дзеўка.

Мараль: калі галава пустая, не дапаможа ніякае чараўніцтва.

І нават музыка...

Мала хто з аўтараў вершаваных радкоў звярнуў увагу на тое, што слухачы ў гэтага музыкі ў пагодны дзень з парасонамі, што яны — хутчэй за ўсё — людзі прыезджыя, прычым здалёку. Для іх, на думку **спадара Мікалая Камароўскага з Оршы**, канцэрт па заяўках:

*— Дык вам усходнія матывы?*
*Адкуль бы родам ні былі вы —*
*На густ любы сыграю вам!*
*Кітай, Карэя ці В'етнам?*

З таго ж канверта:

*Гляджу і думаю, аднак:*
*Якія танцы — вальс, гапак,*
*Лявоніху ці тарантэлу,*
*Цыганачку ці сальтарэлу,*
*Трасуху, танга, крыжачка,*
*Мазурку, польку, трапака... —*
*Узяўся б патлумачыць*
*хто нам —*
*ШТО танцаваць...*
*пад парасонам?*

«Была б музыка, — як нехта казаў, — ногі самі танец прыдумаюць». Адкуль — на адрас «публікі» — цалкам лагічнае... абурэнне ад **спадара Юрыя Вінаградава**:

*Што ж стаіце?*
*Што глядзіце?*
*Танцаваць хутчэй ідзіце!..*
*Зараз кіне дзядзька граць,*
*Локці будзеце кусаць!*

Лёгка сказаць: «ідзіце» (танцаваць), а вось пайсці... Гэта — куды складаней — па розных прычынах. **Спадар Сабалеўскі** пра адну:

*Піражок і чаю шклянка —*
*Вось абед кабетак...*
*А пасля ўжо — прагулянка,*
*І зімой, летам...*
*Калі ж музыка зайграла,*
*Ну яе, з работай!*
*Шкода, хлопцаў побач мала —*
*Танцаваць ахвота.*

(Замалёўка з натуры: канцэрт, на сцэну выходзяць сем чалавек — сыходзяць. Выходзяць яшчэ сорак і таксама знікаюць. Канферансье — гледачам: «Вы паглядзелі кампазіцыю «Сем:сорак».

А маглі б, дарэчы, і станцаваць яшчэ:

*Калі б скінуць гадоў дваццаць,*
*Я не змог бы ўтрымацца!*
*Не марудзячы ніколькі,*
*Танцаваў бы танга, полькі,*
*Вальсаваў бы... Да знямогі!*
*Жаль, цяпер не тыя ногі.*

Піша так **спадар Мікалай Старых з Гомеля**.

Нешта падобнае перажыў і **спадар Сабалеўскі**:

*Быў на танцах «Каму за...»*
*Ат, адна дурнота.*
*З вока выпаўзла сляза,*
*Марная гаркота.*
*Ля сцяны стаіць народ,*
*Дзядзькі ды кабеты.*
*Дзе ж мае 17 год?*
*Клуб вясковы, дзе ты?*

Восень, як той казаў. Мала таго, што на двары, а калі і на сэрцы...

З гэтым трэба нешта рабіць!

Парада ад гумарыстаў: станьце ў ванну ці балею, надзеньце на галаву калготы, «ногі» іх падвяжыце на вяроўкі для сушкі бялізны. Пацішу, памалу пачніце перамяшчацца: вы — тралейбус. Калі пры гэтым надзенеце лыжы — ужо трамвай. Калі ў сваю пасудзіну нальеце вады, — значыць, рачны трамвай. Калі туды ж, у ёмістасць з вадой, упусціце ўключаны фен, вы — электрычка... Калі пры гэтым выключыце святло і начапіце налобны ліхтарык — метро, калі ў ваду плюхнуць газы, — атрымаецца самалёт. Калі пры гэтым яшчэ і фен пакінуць у вадзе — вы ракета і вас — сто да аднаго! — не дагоніць ніякая маркота!

Можна зрабіць і прасцей. Як? Парада ад **сужэнцаў Астроўскіх**:

*Не жыццё без весялосці,*
*А са спевамі — лягчэй.*
*Запяе прыпеўку хтосьці —*
*І гара ўжо з плячэй.*

«Безліч прыпевак ведала мая нябожчыца-свякроў, — піша **спадарыня Раіса Ісакава**. — І спявала іх вельмі цікава: знаходзіла пару, а далей — як у нашым конкурсе — хто каго перасплявае: па чарзе сыпалі яркімі, смачнымі, часам з моцнымі слоўцамі ды намёкамі:

Я гарэлачку люблю,
Гарэлачкі дайце,
Як нап'юся-павалюся,
Хлопцы, не зявайце!



Фота Лізаветы ГОЛАД.

У мяне так, мусіць, не атрымаецца, — працягвае **спадарыня Раіса**, — але ж спроба не хвароба:

*Файна грае наш Мацвей*
*І жыве не галадна...*
*Слухачоў не зразумець:*
*Цёпла ім ці халадна?*

І сапраўды: хто — у куртках, хто — у майках, але ж спыніліся, значыць, нешта зачапіла? Можа, яны моманту чакаюць, каб пагаварыць, каб гарманісту (услед за **спадаром Сабалеўскім**) пытанне задаць:

*— З-пад брыля*
*на ўсіх глядзіш,*
*Граеш досыць тонка,*
*Ды чаму адзін сядзіш?*
*А дзе ж твая жонка?*
*— Яна скрыпачку ўзяла,*
*Села ў пераходзе,*
*Паланэз там завяла.*
*Кажуць, больш у модзе...*

З размоў у аддзеле кадраў: "Ваша прафесія?" — «Саліст». — «Дзе спяваеце-граеце?»—«Дома... Салю капусту, агуркі, памідоры».

Адно што заробіш на гэтым як Заблоцкі... Быў такі прадпрымальнік: паехаў недзе за свет, выменяў жыта на мыла, падлічыў, як шмат зможа на ім зарабіць...

На мытніках хацеў сэканоміць — схаваў тавар на дне карабля. Шлях няблізкі быў, дно крыху падцякала... І выйграў чалавек — увайшоў у гісторыю.

Музыканту са здымка (паводле **спадара Вінаградава**) гэта не пагражае, ён не такі арыгінал:

*Сыну трэба на машыну*
*Тысяч колькі падсабраць...*
*Чым на бульбе гнуць*
*дзе спіну,*
*Лепш на вуліцы пайграць.*

А тым больш, — калі ён умее:

*Файна грае баяніст!*
*Ён маэстра, ён артыст...*
*Баксы, еўрыкі, юані —*
*Зарабляе гэты Ваня.*

А ўсё таму, што (на думку **спадарыні Кусянковай**):

*Спакон веку ў славян*
*У пашане быў баян,*
*Баяніст — заўжды ў цане —*
*Дзеўкам польку разане...*
*А як шклянinfinity, падаць,*
*Хоць да ранку будзе граць.*

Што канкрэтна, — спытае:

*— Вам падэспань?*
*Ці вальс-бастон?*
*— Ды нам хоць што*
*«пад парасон».*

Вось так за слухачоў адказвае **спадар Камароўскі**. Бо яно і сапраўды:

*Каб не песні, не музыкі,*
*Быў бы люд, напэўна, дзікі.*

З тога ж канверта, ад **сужэнцаў Астроўскіх**, досыць праўдзівае:

*Няхай жыццё было паганым,*
*Часамі лёс у крук згінаў,*
*Мы ішлі на танцы пад баяны,*
*Ці прайгравальнік выручаў...*
*Няма цяпер*
*падобнай моды, —*
*Сыграць што дома, —*
*не дадуць...*
*Ідуць музыкі ў пераходы,*
*Каб да сябе любоў адчуць.*

Як ёсць, так ёсць. Як будзе, дасць бог, пабачым. А пакуль — **спадар Сабалеўскі** ад імя таго самага музыкі:

*Вось і лета на зыходзе —*
*Сумная мелодыя...*
*Хтось сыходзіць,*
*Падыходзіць —*
*Тут сяджу заўсёды я:*
*Граю, восень сустракаю,*
*Сонейкам сагрэты.*
*А душа мая спявае —*
*Будзе яшчэ лета!*

Вось на гэтай аптымістычнай ноце і можна было б завяршыць чарговы конкурсны агляд, аднак трэба падвесці вынікі. Такім чынам, на папярэднім здымку (гл. нумар «Звязды» за 7.08 г. г. альбо сайт — Калейдаскоп, «Хто каго») быў буслік... на парозе нейкай установы. І найлепшыя радкі пра яго, паводле вялікага чытацкага журы, напісалі **спадарыні Раіса Ісакава з Чавускага раёна і Любоў Чыгрынава з Мінска, сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадары Віктар Сабалеўскі з Узды, Аляксандр Матошка з Расоншчыны, Мікалай Камароўскі з Оршы, Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка, Мікалай Старых...**

З гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае, таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на першы квартал накіроўваецца ў Гомель.

Хочаце, каб у новым годзе родная газета на роднай мове пяць разоў на тыдзень прыходзіла і да вас, тады варыянтаў два: альбо не спазніцца — аформіць падпіску, альбо ўважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак (унізе), прыдумаць подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных, каротскіх — не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж** шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі не прайшлі — на гэты раз — строгага конкурснага адбору. Затое ў наступны...

*І яшчэ:*
*На баяне татка граў*
*І прыпевачкі спяваў.*
*А цяпер адна гаворка,*
*Што без таткі —*
*горка-горка.*

Гэтыя трывожныя радкі пошта прынесла з Наваполацка ад спадарыні Ганны Паўлавай, удавы пастаяннага ўдзельніка і пераможцы конкурсу «Хто каго?» Мікалая Касмачэўскага. Таленавіты быў чалавек! Смуткуем разам!



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 111/D-3280 (наименование: административное помещение; назначение: административное помещение), площадью 320,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Коньковский с/с, аг. Коньки, ул. Школьная, 5-2**

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 18 230,45 | Размер задатка, руб. | 1 823,05 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Путь новый», 225374, Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Новосельи, ул. Центральная, 14, тел./факс 80163331732. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** в безналичной форме в течение 20 календарных дней с момента государственной регистрации договора купли-продажи. **Срок передачи недвижимого имущества:** в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента оплаты стоимости Объекта. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 18 октября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 17 октября 2024 г. до 17.00.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2024.Ч.002.00111** по продаже недвижимого имущества на электроннойторговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «ВИСТАН», 210627, г. Витебск, ул. Димитрова, 36/7, тел. 8 (0212) 608605.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 05.11.2024 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-107466, площадью 691,9 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/13, наименование – компрессорная с пристройкой, назначение – здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: пристройка.

**Нач. цена: 229 200,00 бел. руб. с учетом НДС.**

**Задаток: 22 920,00 бел. руб.**

